ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафук")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Паскрод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -адатку.

ПРАЛЕТАРЫ ВСІХ КРАІН ЗЛУЧАЙЦЕСЬ

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-86
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

СЕРАДА, 25 чэрвеня 1930 г.
№ 147 (3745)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Вярхоўнаму органу партыі Леніна--XVI зьезду УсеКП(б)

—бальшавікі Беларусі шлюць сваё гарачае прывітаньне

Пад правільным ленінскім кіраўніцтвам бальшавіцкага ЦК УсеКП(б) партыя дабілася буйнейшых перамог у вялікай гістарычнай справе пабудовы сацыялізму

У непрымірымай барацьбе з ухіламі ад генэральнай лініі сталёвай, маналітнай калёнай прышла партыя да свайго зьезду

У ДЗЕНЬ АДКРЫЦЬЦЯ ЗЬЕЗДУ КП(б)Б ВІТАЕ ПРАВАДЫРА НАШАЙ ПАРТЫІ, СТОЙКАГА ЛЕНІНЦА, ЦЬВЁРДАГА І НЕПАХІСНАГА БАРАЦЬБІТА ЗА БАЛЬШАВІЗМ---т. СТАЛІНА

XVI ЗЬЕЗД УсеКП(б)

Адкрываецца XVI зьезд нашай бальшавіцкай партыі. Перад зьездам прайшоў пэрыяд, калі ўся наша партыя на ўсім радзе раённых, акруговых, абласных і рэспубліканскіх канфэрэнцый падагульвала вынікі пройдзенага этапу змаганьня. Канфэрэнцыі праходзілі пад знакам бальшавіцкай згуртаванасьці, жалезнага адзінства партыйных радоў, вялікай актыўнасьці партыйнай масы, пад знакам вернасьці Ленэральнай лініі партыі і яе Цэнтральнага Камітэту.

Усе гэтыя канфэрэнцыі прадэманстравалі **поўную згоду ўсёй нашай партыі з тэй палітыкай, якую ажыцьцяўляў і на гэтым гістарычным этапе Цэнтральны Камітэт УсеКП(б).**

Да XVI зьезду партыя наша падышла з вялізарнымі дасягненьнямі вялікай гістарычнай важнасьці ў справе пабудовы сацыялізму. Наперакор контр-рэвалюцыйным трацкістам, наперакор правым апартуністам, у самым рашучым змаганьні з усімі антыпартыйнымі элемэнтамі наша партыя дабілася вялікіх перамог і посьпехаў у ажыцьцяўленьні ленінскага лёзунгу «дагнаць і перагнаць у тэхнічна-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя дзяржавы».

Пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту наша партыя дабілася пасьпяховага выкананьня 5-цігадовага пляну, практычнага выкананьня лёзунгу «пяцігодка за 4 гады». **Кіруючая роля цяжкай індустрыі** ва ўсім гаспадарчым жыцьці нашага Саюзу захоўвалася і захоўваецца дзякуючы генэральнай лініі нашай партыі. Да зьезду мы маем такія вялікія наказальнікі вялізарных зрухаў у галіне пераможнай індустрыялізацыі Савецкага Саюзу, як пабудова Турксібу, як пабудова Сталінградзкага трактарнага заводу і Растоўскага заводу сельска-гаспадарчых машын. «50 тысяч трактараў—гэта 50 тысяч спарадаў, якія разбураюць стары буржуазны сьвет»— у гэтых яркіх словах ахарактарызавана ўся існасьць нашых дасягненьняў і нашага руху наперад у галіне ператварэньня Саюзу ў край магутнай прамысловасьці, у край незалежны ад капіталістычнага сьвету.

Ільвёрды курс на індустрыялізацыю краю, на разьвіцьцё буйной і цяжкай індустрыі надрыхтавалі пераход сельскае гаспадаркі на рэйкі калектывізацыі, на рэйкі сацыялістычнай рэканструкцыі. Правільная ленінская палітыка Цэнтральнага Камітэту забясьпечыла вялікі паварот асноўных сялянскіх мас да сацыялізму. На падставе суцэльнай калектывізацыі парэй зрабіла, пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту, **гістарычны паварот ад палітыкі абмежаваньня і выцісканьня капіталістычных элемэнтаў вёскі да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы.** Партыя дабілася посьпехаў у відзе вялікага пашырэньня сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі ня ўступкамі кулацтву, як гэта прапанавалі і прапануюць правыя апартуністы, а дзякуючы рашучаму змаганьню супроць кулацтва, дзякуючы таму, што партыя сваячасова зрабіла паварот да ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі і шырокага руху бядняцка-серадняцкіх мас.

Правыя апартуністы кракалі аб пяўхільным правале пасеўнай кампаніі гэтага году. Яны палохалі партыю разрывам саюзу паміж рабочай клясай і сярэднім сялянствам. Яны выкарыстоўвалі і выкарыстоўваюць «левыя» перагібы, па якіх рашуча ўдарыла партыя і яе ЦК, для спроб рэвізаваць генэральную лінію партыі і сарваць наш плян сацыялістычнага будаўніцтва. Скончаная да XVI зьезду на Саюзе пасеўная кампанія паказала, што плян пашырэньня пасеўнай плошчы **ў асноўным выкананы.** Украіна, Паўночны Каўказ, Крым, Сярэдняя Азія і г.д. паказалі дасканалыя прыклады 100-процантнага выкананьня пасеўнага пляну. Гэта пасеўная кампанія праходзіла пры жорсткім супраціўленьні кулацтва і яго агентаў. І кулацкія гаспадаркі цалкам заменены магутным творчым энтузіязмам і работай нашых калгасаў. Калгасы ў гэту пасеўную кампанію паказалі, што яны ня толькі выканалі пляны, але і пакінулі іх далёка ззаду. Калгасы паказалі прыклады высокай дысцыпліны працы, арганізаванасьці і з гэтага змаганьня за бальшавіцкую сяўбу вышлі ўмацаванымі і гатовымі да далейшых баёў за сацыялістычную перабудову вёскі. У выніку правільнай ленінскай палітыкі партыі мы можам сьмела сказаць, што **збожжавая праблема ў асноўным вырашана нашай партыяй.** Перад партыяй паўстала на ўсю шырыню з усёй востраццю праблема жывёлагадоўчая. Партыя стаіць на правільным шляху вырашэньня гэтай праблемы і перамогі ўсіх харчовых труднасьцяй. Мільёны прапоўных мас, пад кіраўніцтвам нашай партыі, у засеўнай кампаніі гэтага году трымалі і вытрымалі экзамэн поўнай гатоўнасьці да змаганьня за сацыялістычную рэканструкцыю вёскі, за далейшае разгортваньне калгаснага руху і ільвёрдае ажыцьцяўленьне палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Наша партыя, пад кіраўніцтвам ЦК здолела вакол справы сацыялістычнага будаўніцтва арганізаваць вялікі творчы энтузіязм шырокіх мас рабочае клясы, згуртаванасьць вакол нашай партыі шырокіх працоўных мас. Сацыялістычнае спаборніцтва, новыя формы працы, масавы прыцёк у нашу партыю лепшых кадраў рабочае клясы—усё гэта вялікія паказальнікі таго, што наша партыя—авангард пралетарыяту—вядзе за сабою рабочую клясу і асноўныя масы сялянства на шляху ўпартага змаганьня за сацыялізм.

За пройдзены этап наша партыя, дзякуючы ажыцьцяўленьню на справе ленінскай нацыянальнай палітыкі—дабілася магутнага прамысловага, агульнагаспадарчага і культурнага разьвіцьця нацыянальных рэспублік і вобласьцяй. Пры дапамозе ўсяго Сав. Саюзу пасьпяхова разгортваючы сацыялістычнае будаўніцтва, мы дабіваем, крок за крокам рэшткі фактычнай няроўнасьці раней прыгнечаных царызмам народаў.

50-цігадовы юбілей прызнанага правадыра нашай партыі т. **Сталіна** быў адзначальнай дэманстрацыяй вернасьці пралетарскіх мас Савецкага Саюзу свайму выпрабаванаму кіраўніку—бальшавіцкай партыі. У асобе т. Сталіна—вернага пасьлядоўцы і цьвёрдага вучня Леніна—увасобілася бальшавіцкая непрымірымасьць і пяўхільнасьць нашай партыі. Не дарма імя т. Сталіна выклікала і выклікае заядлыя нападкі з боку ўсіх ухілісцкіх элемэнтаў унутры нашай партыі, з боку клясавага ворага ўнутры краю, з боку ўсёй міжнароднай буржуазіі. Тая дэманстрацыя бальшавіцкага адзінства партыі, якую мы бачылі ў дзень юбілею т. Сталіна, паказала, што наша партыя, моцная, маналітная і верная наказам Леніна, цьвёрда ідзе па яго шляхох—змаганьня за пабудову сацыялістычнага грамадзтва.

Уся падрыхтоўка да XVI зьезду нашай партыі паказала, што гэты зьезд прадэманструе, што наша партыя зараз, **як ніколі, згуртавана на актыўнай абароне генэральнай лініі, на непрымірымай барацьбе супроць ухілаў ад гэтай лініі перш за ўсё супроць правай небясьпекі, як галоўнай.** За ўвесь пройдзены этап, партыя, пад кіраўніцтвам ЦК, разьбіла рэшткі контр-рэвалюцыйнага трацкізму і правяла пасьпяховую барацьбу супроць бухарынскай апазыцыі, супроць права-апартуністычнага ўхілу. За апошні час мы бачым новае ажыўленьне права-апартуністычных элемэнтаў у нашай партыі. Артыкул Мамаева зьяўляецца яскравай пляцформай правых апартуністых, гэтых **кулацкіх агентаў у нашай партыі.** Партыя дала рашучы адпор вылазкам права-апартуністычных элемэнтаў. Уся партыя аднадушна патрабуе, каб былыя лідэры правай апазыцыі (Бухарын, Рыкаў. і г. д.) спынілі сваё маўчаньне, якое ва ўмовах змаганьня за лінію партыі, змаганьня супроць ухілаў можа быць расцэнена партыяй толькі як нежаданьне, разам з партыяй і пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту, не на словах, а на справе, весьці гэта змаганьне. Якавы адносіны былых лідэраў правай апазыцыі, капітуляваўшых пад націскам партыі на лістападаўскім пленуме, да мамаеўскай пляцформы, якавы адносіны іх да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, як ацэньваюць яны тыя клясавыя зрухі, якія адбыліся ў краі, ці гатовыя ны да актыўнага змаганьня за лінію партыі—на ўсе гэтыя пытаньні партыя патрабуе яснага і нядвузначнага адказу. **Партыя не пацерпіць ніякага даўрушництва, ніякіх слоўных адгаворак, ніякага прымірэнцтва.**

КП(б)Б—непарыўная частка ўсёй УсеКП(б)—падыйшла да XVI зьезду, **як згуртаваны бальшавіцкі атрад. БАЛЬШАВІКІ БЕЛАРУСІ ШЛЮЦЬ СВАЁ ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ XVI-МУ ЗЬЕЗДУ УсеКП(б).** Усе арганізацыі будуць з неаслабнай увагай сачыць за работамі нашага зьезду. Наша партыя здолее лінію і задачы, якія вызначыць XVI зьезд, ператварыць у кроў і плоць змаганьня за сацыялізм, за перамогу міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі.

За Ленінскую лінію партыі!

Рабочыя, калгасьнікі, чырвонаармейцы дэманструюць сваю жалезную згуртаванасьць вакол бальшавіцкай партыі, сустракаюць XVI зьезд новымі ўзорамі ўдарнай работы

Сёньня пуск Магілеўскага мастаўёвага заводу

У радзе месц закладваюцца новыя прадпрыемствы

Дзень адкрыцьця XVI партыйнага зьезду БССР адзначае закладкай раду новых прадпрыемстваў.

У Крычаве адбудзецца закладка цэмэнтнага заводу, коштам у 7 млн. р. Прадукцыйнасьць заводу — 700.000 бочак цэмэнту ў год. Пабудова заводу будзе скончана 1 красавіка 1931 г.

У Магілеве адбудзецца закладка косьцяапрапоўчага заводу, на пабудову якога асыгнавана 1.800.000 рублёў. Пабудова заводу будзе скончана ў 1931 годзе.

У Менску пачынаецца будаўніцтва Дому Друку, які дасьць магчымасьць сканцэнтраваць усе выдавецтвы, якія працуюць у Менску. На пабудову Дому Друку ВСНГБ асыгнаваў 1.800.000 рублёў.

У Магілеве адбудзецца пуск мастаўёвага заводу па апрацоўцы скуры. Прадукцыйнасьць заводу — 200.000 буйных скур у год. Пабудова заводу каштавала 2 млн. 500 тыс. руб.

Растуць і мацнеюць калгасы

наперакор прароцтвам апартуністых

З розных раёнаў БССР у рэдакцыю «Зьвязды» паступаюць прывітаньні і рапарты XVI зьезду УсеКП(б) ад калгасаў БССР.

У гэтых рапартох калгасьнікі падагульваюць свае дасягненьні за час веснавой сяўбы, ухваляюць тэзісы да зьезду ад калгасным будаўніцтве і абяцаюць прылажыць усе сілы, каб зрабіць гаспадаркі ўзорнымі, каб узьняць ураджайнасьць, каб наладзіць працу ў калгасах.

Рапарты калгасаў зьяўляюцца добрым адказам усім тым, хто імкнецца падарвацъ, калгаснае будаўніцтва, хто прабуе пераглядзець лінію партыі ў сацыялістычнай рэканструкцыі с.-г.

Калгас імя Чарвякова, Віцебскага сельсавету, рапартуе, што за дзе апошнія гады ён узрос з 19 гэкт. да 300. Перавыкананы плян пасеву тэхнічных культур. Калгас ідзе ўперад, рашуча змагаючыся з варожымі элемэнтамі. Уся работа ў калгасе разьмеркавана па брыгадах.

Калгасьнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі ў часе ўборачнай кампаніі.

У гонар XVI партзьезду калгас будуе 2 сіпасныя ямы і засявае ½ гэкт. кукурузы.

З Гарадоцкага раёну паведамляюць, што прапрацоўка тэзісаў па дакладу тав. Якаўлева праходзіла з вялікай актыўнасьцю, пры шырокім удзеле калгасьнікаў. Усе ячэйкі ўхвалілі тэзісы і цалкам дапучыліся да іх.

У падарунак XVI партзьезду засеяна 36,5 гэкт. ільну.

У Малажынскім сельсавеце, Брагінскага раёну, тэзісы па дакладзе тав. Якаўлева прапрацоўваліся ва ўсіх калгасах. На сходах, акрамя членаў партыі і камсамольцаў, прысутнічала шмат калгасьнікаў і індывідуальнікаў. У Храповічах 16 актыўных калгасьнікаў падалі калектыўную заяву аб прыёме ў партыю, у Малажыне падалі заяву 11 чалавек.

Калгас «Дняпровец» узяў на сябе абавязак арганізаваць да XVI зьезду малочную фэрму, пашырыць пасеўную плошчу, рэгулярна праводзіць вытворчыя нарады. Калгас «Першамайскі» пастанавіў да восені засеяць усю зямлю, пусьціць цагельны завод, пабудаваць сіпасную яму.

У Бешанковіцкім сельсавеце, Віцебскай акругі, тэзісы тав. Якаўлева прапрацаваны на 21 сходзе. У падарунак XVI зьезду УсеКП(б) засеяны 22 гэкт. ільну.

Калгас «Культура», Лёзьненскага раёну, Віцебскай акругі, паведамляе, што гаспадарка расьце і мацнее з кожным днём. Сяўба скончана своячасова, плян сяўбы перавыкананы на 113 проц. Поўнасьцю праведзена кантрактацыя ўсіх культур.

За ўвесь час пасеўнай кампаніі ня было ні аднаго прагулу.

Раз у месяц выходзіць насьценгазэта, арганізаваны чырвоны куток.

У падарунак XVI зьезду калгас засявае 2 гэктары ільну.

У рапартох калгасьнікі запэўняюць партыю, што яны па-ўдарнаму будуць рыхтавацца да ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі.

Добрай арганізацыяй працы калгасьнікі пакажуць індывідуальнікам выгады калектыўнае гаспадаркі.

Ад ударных палкоў---да ўдарных дывізій

Рапарт №-й Беларускай дывізіі

Беларуская дывізія рапартуе XVI зьезду УсеКП(б).

— Партарганізацыя дывізіі ідэалёгічна ўстойлівая, моцна згуртаваная навакол генэральнай лініі партыі, актыўна змагаецца за чыстату ленінскіх прынцыпаў, даючы рашучы адпор правай небясьпекі, як галоўнай на даным этапе, адначасова не паслабляючы барацьбы з прымірэнцтвам, «левымі» загібамі і рэцыдывамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму.

Навакол асноўных пытаньняў XVI зьезду мабілізавана ўвага ўсёй масы байцоў. Тэзісы XVI зьезду сустрэлі поўнае адабрэньне з боку партарганізацыі, начскладу і чырвонаармейцаў. Чыр-цы і начсклад разумеюць генэральную лінію партыі, актыўна падтрымліваюць пёзунгі партыі. У апошні час ў партыю ўступіла 129 чалавек, у тым ліку і взтэраны грамадзянскай вайны.

Значная колькасьць байцоў, якія падлягаюць дэмабілізацыі, у бягучым годзе зьяўляюцца калгасьнікамі; 800 байцоў рыхтуюцца на спэцыяльных курсах для практычнага ўдзелу ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Чыр-цы і начсклад добра разумеюць складанасьць міжнароднай абстаноўкі і ўсё нарастаючую небясьпеку вайны. Байцы выконваюць задачы, пастаўленыя РВС СССР, па максымальным росьце баявой падрыхтоўкі, па вуладаньні тэхнічнымі сродкамі вайны, па павялічэньні тактычнай падрыхтаванасьці.

Байцамі дывізіі быў узят на сябе абавязак да XVI зьезду ліквідаваць недахопы ў справе баявой падрыхтоўкі, цалкам апраўдаць годнасьць ударных часьцей, якімі зьяўляюцца ўсе часьці дывізіі, і абвясьціць уся дывізію ўдарнай.

Напружанымі тэмпамі работы чырвонаагрмецы і начсклад дабіліся палепшэньня якасьці баявой падрыхтоўкі. Шляхам сац. спаборніцтва і ўдарніцтва дасягнуты новыя вышэйшыя паказальнікі па радзе галін баявой падрыхтоўкі. Аднак, з поўнай адказнасьцю байцы заяўляюць, што рабеты баявой падрыхтоўкі яшчэ цалкам не ліквідаваны, што патрэбна дагэтуль напружаная работа па зьнішчэньні прарываў і выкананьні лёзунгу — «ад ударных палкоў да ўдарнай дывізіі».

Пераменьнікі часьцей раўняюцца па кадравых часьцях у справе баявой падрыхтоўкі, паказваючы поўную сьвядомасьць і разуменьне задач, якія стаяць перад Савецкім Саюзам і Чырвонай арміяй.

Цесная сувязь часьцей дывізіі з пралетарыятам і працоўным сялянствам Беларусі дае магчымасьць павялічыць баяздольнасьць часьцей.

Беларуская дывізія рапартуе XVI зьезду УсеКП(б) — кіраўніку Савецкай краіны і Чырвонай арміі — што яна гатова выканаць першы заклік камуністычнай партыі.

Няхай жыве XVI зьезд УсеКП(б). Няхай жыве УсеКП(б) і яе Ленінскі ЦК!

Вр. камдыў 2 Беларускай ПУЛКА-ДЗЬМІТРЫЕЎ.
Зам. начпадыў ІВАНОЎ.

Першая сквазная ўдарная брыгада імя XVI партзьезду

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). На машына-будаўнічым заводзе «Пралетары» арганізавана першая ў БССР сквазная ўдарная брыгада імя XVI партзьезду.

Сквазная брыгада ядкае ўсіх рабочых заводу, якія працуюць па вырабе дэталяй для растворамяшалак. У брыгаду ўваходзяць 105 ударнікаў.

Сквазная брыгада ставіць сабе асноўнай задачай зьнішчыць няўвязкі і бесплянавасьць, якія ёсьць паміж цэхамі. Ударная сквазная брыгада ўзяла на сябе абавязацельства — ўсе паказальнікі прамфінпляну выканаць са значным перавышэньнем.

Заводзкія арганізацыі, за выключэньнем камсамольскай, аказваюць максымальную дапамогу арганізацыі сквазной брыгады. Вялікую арганізацыйную дапамогу аказала рэдакцыя «Полесской Правды».

ПАПЯРЭДНІЯ ВЫНІКІ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ Ў БССР

цалкам сьцьвярджаюць правільнасьць генэральнай лініі партыі

Сяўба ў БССР канчаецца.---Саўгасы перавыканалі павялічаны плян на 9,5 проц.---Калгасы вельмі добра справіліся са сваёй задачай, перавыканаўшы свае заданьні.--- Індывідуальны сэктар ужо засеяў свой леташні яравы клін. Плошча засеваў да сучаснага моманту пашырана на 5 проц.

На сёньнішні дзень яшчэ няма канчатковых выніковых даных. Весткі, якія паступілі з округ, гавораць аб выкананьні 95% пашыранага пасеўнага пляну. Гэта сьведчыць аб тым, што к цяперашняму моманту веснавая сяўба па БССР ужо заканчваецца.

Адзін той факт, што па 15 чэрвеня засеяна 2.263.000 гэктараў яровага кліну, супроць 2.151.000 гэкт. усяе плошчы яравога кліну, засеянага леташ у веснавую кампанію, ужо гаворыць аб тым, што ўсякія кулацкія гуткі і прадраканьні правых апартуністых аб недасеве разьбіты ўшчэнт. Пашырэньне на 15 чэрвеня пасеўнае плошчы на 5 проц. у параўнаньні з плошчай яравога кліну мінулага году мае асабліва вялізарнае значэньне. Гэты факт сьведчыць, што намечаны ўрадам плян пашырэньня пасеўнай плошчы аказаўся рэальным, наперакор прадраканьням няберучых ва ўзятыя партыяй тэмпы, быццам, ва ўмовах інтэнсыўнага зямляробства Беларусі яго ажыцьцёвіць ня ўдасца.

Вялізарнейшым дасягненьнем веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі зьяўляецца тое, што **сацыялістычны сэктар закяў 20 проц. усіх яравых пасеваў, супроць 4 проц. у мінулым годзе. Беларускія саўгасы** паказалі прыклад сапраўднай баявой работы і разуменьня задач, ускладзеных на іх партыяй. Яны **перавыканалі свой пасеўны плян на 9,5 проц. і пашырылі пасеўную плошчу мінулага году на 34 проц.**

Дасканала справіліся з сяўбой беларускія калгасы. Ня гледзячы на рад труднасьцяй (заняжкі з зямляўпарадкаваньнем, кепская арганізацыя працы, недахват цягавай сілы і г. д.), ня гледзячы на падрыўную работу і моцную агітацыю кулацкіх элемэнтаў, калгасы першымі скончылі сяўбу ў большасьці раёнаў, перавысіўшы свае пасеўныя пляны.

Сёлетняя бальшавіцкая сяўба карэнным чынам зьмяніла твар беларускай вёскі. У той час, як летась у гэту пару ў БССР калгасы аб'ядналі толькі 2 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і займалі 3,8 проц. усяе пахаці, яны зараз ужо яднаюць 12 проц. бядняцка-серадняцкіх двароў і займаюць 16 проц. пахаці.

Той факт, што сёлета сацыялістычны сэктар БССР дасьць пралетарскай дзяржаве прыкладна 25-30 проц. таварнай прадукцыі ўсёй сельскай гаспадаркі рэспублікі, зьяўляецца вялізарным дасягненьнем партыі і рабочае клясы.

Сёлетняй пасеўнай кампаніяй калгасы яшчэ раз пацьвердзілі сваю жыцьцяздольнасьць, абверглі праваўхілісцкія тэорыі і плёткі, практычна даказалі правільнасьць генэральнай лініі партыі. Беларусь, ступень мэханізацыі калгасаў якое нязьмерна ніжэйшая, чым у іншых збожжавых раёнах Савецкага Саюзу, асабліва характэрна ў гэтых адносінах. **Пасьпяховае правядзеньне сяўбы беларускімі калгасамі на практыцы пацьвярджае правільнасьць ленінскай думкі аб вялізарнейшых перавагах нават простага складаньня сялянскіх сродкаў вытворчасьці.**

Індывідуальны сэктар, які займае яшчэ значнае месца ў БССР, з прычыны цэлага раду памылак і скажэньняў партыйнае лініі на мясцох, у прыватнасьці, пры адводзе зямель, забесьпячэньні сродкамі вытворчасьці і г. д., прыступіў да сяўбы са спазьненьнем. Аднак, дзякуючы прынятым партыяй рашучым мерам па ліквідацыі скажэньняў, якія мелі месца ў адносінах індывідуальнікаў—бедняцкую і серадняцкую, ня гледзячы на кулацкія манэўры і агітацыю за зрыў сяўбы індывідуальнікамі, — індывідуальны сэктар сяўбу разгарнуў і ў асноўным яе ўжо з посьпехам закончвае.

Плошча пасеваў гэтых гаспадарак на сёньнішні дзень **ужо ня ніжэй** плошчы мінулага году. Гэта яскрава пацьвярджае, што гуткарскі аб «размычцы» рабочае клясы з бядняцка-серадняцкім сялянствам пыты белымі ніткамі. Сапраўднасьць гаворыць аб тым, што саюз з серадняком ня толькі не парушаецца, а з кожным днём яшчэ больш умацоўваецца, што палітыка партыі ў вёсцы зусім правільная і не адчувае патрэбы ні ў якіх рэвізіях.

БССР дабілася значных вынікаў у **якасным** выкананьні пасеўнага пляну. Асноўнай задачай было павысіць удзельную вагу тэхнічных, прамышленных культур і траў. Па бульбе мы ўжо на сёньнішні дзень маем поўнае выкананьне пасеўнага пляну і пават яго перавыкананьне. Тэхнічнымі культурамі і сеяннымі травамі намечаная плошча, праўда, яшчэ не засеяна, **але леташні плян ужо выкананы.**

Перавыкананьне пляну па прамышленных культурах зьяўляецца вельмі важным момантам для БССР, як для раёну асноўнай сьвінагадоўлі. Не малое значэньне мае факт значнага пашырэньня плошчы пад асноўныя сеяныя травы. Пасевы пад канюшыну, напрыклад, пашыраны на 50 проц.

Урэшце, трэба адзначыць, што веснавая пасеўная кампанія глыбока закрапула пытаньні жывёлагадоўлі ў БССР і асабліва сьвінагадоўлі. Беларусь паставіла перад сабою канкрэтную задачу—ліквідаваць прарывы ў галіне жывёлагадоўлі і фарсаваць яе разьвіцьцё, у першую чаргу сьвінагадоўлі.

У сувязі з вялізарнымі мерапрыемствамі ў галіне жывёлагадоўлі у БССР прынят рад канкрэтных мер па ўзмацненьні кармавое базы. Асаблівай увагі заслугоўвае сіласаваньне. Гэта мерапрыемства, трэба прызнаць, ажыцьцяўляецца ў Беларусі ня так хутка, як было-б пажадана, але-ж гэта тлумачыцца, галоўным чынам, тым, што сіласныя культуры ў нашай краіне сеюцца сёлета ўпершыню, а сіласаваньне ва ўмовах БССР зьяўляецца зусім новым мерапрыемствам.

Паданая характарыстыка папярэдніх выпікаў веснавой сяўбы ў БССР на практыцы пацьвярджае правільнасьць генэральнай лініі партыі. Перавод 87 тысяч дробных сялянскіх гаспадарак на шлях будаўніцтва буйной сацыялістычнай гаспадаркі, які адбыўся за мінулы год, з посьпехам праведзеная калгасамі веснавая сяўба —зьяўляюцца моцнай асновай для далейшага прасоўваньня на гэтым шляху, да разгортваньня патрэбных тэмпаў калгаснага будаўніцтва, ажыцьцяўленьня дырэктывы партыі аб ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі.

Зразумела, што дасягнутыя посьпехі маглі-б быць больш значнымі, калі-б у радзе арганізацый Беларусі ня мела месца «галавакружэньне ад посьпехаў», калі-б ня «левыя» загібы, якія значна ўскладнілі работу партыі і прымусілі затраціць шмат сіл і энэргіі на барацьбу са скажэньнямі і памылкамі.

Трэба ўлічыць усе памылкі, дапушчаныя ў практычнай рабоце па веснавой пасеўнай кампаніі, каб узбраенымі спаткаць уборачную і асеньнюю пасеўную кампаніі, скарыстаўшы іх для далейшага разгортваньня сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі Беларусі. **Уборачная і асеньняя пасеўная кампаніі павінны ня толькі замацаваць калгасы сэктар, але і даць новы [illegible] прыліў у калгасы.**

У прыватнасьці, трэба максымум увагі зараз аддаць будаўніцтву сьвінагадоўчых гаспадарак, якія ў БССР павінны адыграць [illegible] фабрык, у свой час разгорнутых у збожжавых раёнах Савецкага Саюзу.

Н. Рачыцкі.

Ленінскае загартаваньне баявыя дасягненьні--чырвонаармейскі падарунак зьезду

Рапарт №-й Самарскай кавалерыйскай дывізіі

Цалкам і поўнасьцю ўхваляючы генэральную лінію партыі на індустрыялізацыю краю і сацыялістычную перабудову вёскі, чырвонаармейцы і начальніцкі склад дывізіі ўмацоўваюць сваю баявую і палітычную падрыхтоўку.

Мэтадамі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ўвесь склад дывізіі дабіваецца таго, каб тэмпы нашай баявой і палітычнай падрыхтоўкі адпавядалі-б тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва ў краі, каб у патрэбны момант даць адпор усім тым, хто прабуе парушыць сацыялістычнае будаўніцтва.

Да XVI зьезду УсеКП(б) усе часьці дывізіі зьяўляюцца ударнымі часьцямі, каля 90 проц. усяго складу дывізіі — індывідуальныя ўдарнікі.

У дывізіі вырасьлі і ўмацаваліся кіраўнікі і арганізатары першай у БССР чырвонаармейскай камуны імя БВА. І зараз 90 проц. чырвонаармейцаў, якія званьняюцца ў бестэрміновы водпуск, запісаліся ў калгасы.

Увесь перадзьвездаўскі матар'ял даведзен да байца. Тэзісы тав. Якаўлева, Куйбышава і Швэрніка цалкам і поўнасьцю адабраюцца ўсім складам дывізіі.

Работа партыйных і камсамольскіх арганізацый накіравана на палепшэньне якасьці баявой і палітычнай падрыхтоўкі байца.

Маладыя байцы пасаджаны ў сядло і ўмела ўладаюць халодной зброяй, паражаючы на быстрым апюры цэлі — шашкай да 80 проц. і пікай да 90 проц.

Байцы шляхам пепшага дагляду дабіліся зьніжэньня захворваньня конскага складу.

Страйковая падрыхтоўка з кожным месяцам расьце і ўдасканальваецца. Выконваецца сацдагавор з Чангарскай кавдывізіяй.

За апошнія 2 з паловай месяцы па дывізіі падана каля 450 заяў у партыю, з якіх звыш 60 проц. рабочых і батракоў і 8 проц. камандніага складу.

Усе гэтыя дасягненьні не даюць нам права супакойвацца і лічыць, што ў справе палепшэньня баявой падрыхтоўкі дывізіі абстаіць усё поўнасьцю добра. Мы маем яшчэ рад недахопаў у асобных зьвяньнях вучобы, і ўвесь склад дывізіі прыкладзе максымум намаганьняў да таго, каб іх у найкарацейшы тэрмін ліквідаваць.

Гэтаму зарука — рост палітычнай сьвядомасьці байцоў, значнае палепшэньне кіраўніцтва партыйна-камсамольскай арганізацыі.

Камандзір - камісар дывізіі РАКАСОЎСКІ.
Ч. в. а. начальніка палітаддзелу КАЛЕСЬНІКАЎ.

Дзесяцідзенны паход камсамолу

Тэлеграма ўсім акругкомам камсамолу і акрза

Пастановай Наркамзему і ЦК камсамолу абвяшчаецца дзесяцідзенны паход у мэтах засеву нескарыстнае плошчы сіласнымі культурамі.

Разгарнеце навокал дзесяцідзеўкі ўвагу трамадзкасьці, шляхам асьвятчыня у друку, скарыстаньня усіх прапагандысцкіх сіл і арганізацый ударных брыгад для выкананьня гэтага мерапрыемства, якое мае, вялікае значэньне ў вырашэньні кармовае праблемы і патрабуе напружанай работы ад камсамольскіх і зямельных арганізацый.

Папякоў, Масееў.

ПЛЯН СІЛАСАВАНЬНЯ ПА ВІНЕН БЫЦЬ ВЫКАНАНЫ

Пастанова ўпоўнаважанага СНК БССР па пасеўнай кампаніі

У зьвязку з непрыняцьцем дастатковых мер па правядзеньні сіласаваньня кармоў у саўгасах, калгасах, вытворчых каапэрацыйных аб'яднаньнях

ПРАПАНУЮ:

1. Дырэктарам Белсельтрэсту, Сьвінатрэсту і Праўленьням Белкалгасцэнтру і Белмалжывёлсаюзу ўскласьці спагнаньне на асоб, якім даручана выкананьне пляну сіласаваньня і яго ня выконваюць. Папярэджваю, што ў выпадку няпрыняцьця мер у далейшым вінаватыя будуць прыцягвацца да адказнасьці.

2. Папярэдзіць усіх загадчыкаў АКРЗА і акруговых саюзы сельска - гаспадарчай каапэрацыі, што няпрыняцьце мер з іх боку выкліча прыцягненьне вінаватых да адказнасьці.

3. Абавязваю кіраўнікоў цэнтральных устаноў і арганізацый, маючых дачыненьне да правядзеньня ў жыцьцё дырэктыў партыі і ўраду па пытаньням аб сіласаваньні, вылучыць пэрсанальны склад асоб, сьпіс якіх у адназенны тэрмін паведаміць у штаб па сіласаваньні.

УПОЎНАВАЖАНЫ СНК БССР ПА ПАСЕЎКАМПАНІІ РАЧЫЦКІ.

XIII зьезд КП(б)Б

Калгасны рух і ўздым сельскай гаспадаркі

Даклад тав. Рачыцкага

У сувязі з тым, што тав. Галадзед у сваім дакладзе даў досыць поўную палітычную ацэнку і аналіз аб ходзе калектывізацыі, якою ў мяне ніякіх разыходжаньняў няма і да якое я цалкам далучаюся і ў гэтых рацыяналізацыі працы, дазвольце мне перайсьці да канкрэтных пытаньняў, якія неабходна абгаварыць і вырашыць на даным зьезде з улікам, як станоўбоке за час з XII зьезду КП(б)Б. Як найлепш канкрэтна ў практыцы ажыцьцявіць лёзунг партыі пераводу індывідуальных дробных гаспадарак у буйную сацыялістычную гаспадарку, унікаючы тых памылак, якія мелі месца ў гэтай галіне.

Адпак, перш чым перайсьці да гэтых пытаньняў, я лічу неабходным спыніцца на асноўных паказальніках у галіне разьвіцьця сельскае гаспадаркі, як выконваецца той пяцігадовы плян, які разьвезьлае КП(б)Б і XII зьезд КП(б)Б на пяцігадовым плане разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР у разьдзеле «Сельская гаспадарка» на мецыу асноўныя наступныя ліміты—на пашырэньне пасеўнай плошчы да канца пяцігодкі на 15 проц., ўздым ураджайнасьці—на 45 проц., павышэньне ўдзельнае вагі сацыялістычнага сэктару—на 12 проц., павялічэньне стала буйной рагатай жывёлы — на 25 проц., свіней—на 47 проц., валавая прадукцыя ад сельскае гаспадаркі павінна вырасьці наводзе пляну пяцігодкі на 59,1 проц., і таварная—да 17,1 проц. супроць 8,10 проц. ад валавой прадукцыі.

Як выконваюцца гэтыя асноўныя паказальнікі, якія былі вызначаны XII зьездам КП(б)Б?

Пасеўная плошча, калі намечаны плян пашырэньня веснавога кліну, які запраектаваны ў гэтым годзе, будзе цалкам выкананы, а мы яго павінны выканаць, будзе выканана на 75,6 проц. пляну пяцігодкі; прычым па тэхнічных культурах—77 проц., кораньплодах—58,5 проц., сеяных травах—64 проц.

У адносінах павышэньня ўдзельнай вагі сацыялістычнага сэктару ў сельскай гаспадарцы мы перавыканалі пяцігодку. Замест устаноўленых 12 проц. ўдзельнае вагі да канца пяцігодкі, мы зараз маем 17 проц. (зямельная плошчы) і мелі-б значна больш, калі-б не параблі тых памылак у практычнай рабоце, аб якіх тут гаварылі ў сваіх дакладах т. Гей і Галадзед і на якіх я спыняцца ня буду а тае прычыны, што аб іх даволі поўна сказаў тав. Галадзед. Толькі скажу, што гэтыя памылкі і скрыўленьні партыйнай лініі насілі амаль што ва ўсіх раёнах адпольны характар з тэй толькі розьніцай, што ў адных раёнах іх было менш, а ў другіх больш. Лік гаспадарак які вылічваўся да арганізацыі к канцу пяцігодкі—4.561, а зараз ёсьць 3.021 гаспадарак. Да канца пяцігодкі мы павінцы, згодна пастановы XII зьезду, ахапіць 79.400 сялянскіх гаспадарак, а зараз, на падставе тых вестак, якія мы маем на 20 мая, ахоплена 87.255 гаспадарак. Сярэдні разьмер плошчы на адну калгасную гаспадарку паводле пяцігадовага пляну намечан у 166 гектараў, а зараз ёсьць 210 гэкт. Насеўная плошча калгасаў складае прыкладна 205-210 тыс. гэкт. Да лініі савецкіх гаспадарак пяцігадовым пляном намячалася пашырыць плошчу зямлі на 60.000 гэкт., з іх за лік асушкі балот—50.000 гэкт. За гэты час мы маем прырост зямельнай плошчы саўгасаў, прыкладам, на 50.000 гэкт. Такім чыным, як відаць, у гэтай частцы пяцігадовы плян будзе выкананы за больш кароткі тэрмін і, у прыватнасьці, да канца пяцігодкі мы ў асноўным будзем мець моцны сацыялістычны сэктар у сельскай гаспадарцы. Індывідуальны сэктар ня будзе адыгрываць колькі-небудзь значную ролю. У сувязі з гэтым нам прыдзецца ўнесьці карэктывы ў пяцігадовы плян.

Плян разьвіцьця сельскае гаспадаркі канкрэтна ператвараецца з максымальнага ў мінімальны. Ня дрэнна ў асноўным выконваецца пяцігодка ў галіне мэліярацыі. Намечаны плян будзе выкананы таксама за больш кароткі тэрмін. Гэта нашы плюсы.

Цяпер дазвольце перайсьці да тых участкаў, на якіх ёсьць у нас небясьпека і зьяўляецца жывёлагадоўлі. Тут мы ня толькі ня маем павялічэньня стада на 25 проц., як гэта ўказаў XII зьезд, а наадварот, маем значнае зьніжэньне вагавое і таварнае прадукцыі ў гэтай галіне сельскае гаспадаркі БССР. Няважна абстаіць справа з павышэньнем ураджаю. Валавая і таварная прадукцыя застаецца зусім ніякая і ў гэтай частцы ніякага адстае, ня вытрымліваючы пяцігодкі. Вось кароткі малюнак выкананьня пяцігадовага пляну за гэты адрэзак часу на асноўных паказальніках.

Першае пытаньне, якое лічу патрэбным паставіць, гэта пашырэньне пасеўных плошчаў і павышэньне ўраджайнасьці. Мне здаецца, што гэтае пытаньне не займала таго месца ў рабоце партыйных, савецкіх і каапэрацыйных арганізацый, якое яно павінна займаць. Гэту справу нельга адсунулі на другое месца, спасылаючыся на тое, што ўсе заняты справай калектывізацыі. А тут адно ад другога аддзяляць нельга. Задача павышэньня ўраджаю была і застаецца асноўнай задачай усёй партыі, усяе рабочае клясы. Без павышэньня ўраджаю, пашырэньня пасеўнай плошчы ня могуць быць павялічаны рэсурсы харчаваньня і сырцу, необходныя для сацыялістычнага будаўніцтва і паляпшэньня дабрабыту працоўных. Мы слаба скарыстоўваем усё тое, што мы маем і што зьяўляецца асноўнымі сродкамі для павышэньня ўраджаю. Праблема ўгнаеньня, хэмізацыя сельскае гаспадаркі ў нас не займае таго месца, якое ім павінна быць адведзена ў галіне павышэньня ўраджаю. Гной скарыстоўваецца нерацыянальна, пляны вапнаваньня і тарфаваньня глебы ня выконваюцца (выкананы толькі на 15-20 проц.), лубінізацыя належным чынам не разгорнута. Адносіны да гэтых мерапрыемстваў з боку раду савецкіх і каапэрацыйных арганізацый нядбайныя, месцамі ёсьць заганваны сабатаж. Такога становішча ў далейшым не павінна быць. За гэту справу трэба ўзяцца з большай рашучасьцю, прызваць на службу ўсе тыя сродкі, якія зручны для сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба паўней улічыць тыя багацьці, якія мы маем, і скарыстаць іх. На правядзеньне аграмінімуму таксама не зварачаецца належная ўвага. На гэту справу трэба арганізаваць цыркіі колы сялянскай беднаты і серадняцкоў праз каапэрацыйныя аб'яднаньні. Між тым, каапэрацыйную нізоўку ўтрацілі, а гэта той сродак, праз каторы мы павінны праводзіць усе гэтыя мерапрыемствы. Вось вам лічбы: на 1/X 29 г. мы мелі 3.348 каапэрацыйных аб'яднаньняў, 544.975 членаў, ці 69 проц. каапэраваных гаспадарак, а што мы маем зараз, на 1 мая 1930 г. на сыстэме паляводчай каапэрацыі—4,5 проц., малочна-жывёлагадоўчай—9,5 проц., садова-гародняй—0,26 проц., на іншых відах ніякіх вестак у нашых каапэрацыйных цэнтрах няма. Трэба лічыць, што яны ня існуюць. Трэба зараз-жа ўзяцца за аднаўленьне распушчанай нізоўкі прасьцейшых відаў вытворчай каапэрацыі. За гэту справу павінны ўзяцца ня толькі каапэрацыйныя арганізацыі, а ўся партыя. Без арганізацыі сялянства, бяз нізоўкі мерапрыемстваў масавага парадку нам не падняць.

Другое асноўнае пытаньне, якое трэба абгаварыць і вырашыць,—гэта шляхі і тэмпы павялічэньня ўдзельнае вагі сацыялістычнага сэктару, будаўніцтва калгасаў і саўгасаў, якія задачы стаяць перад намі ў гэтай галіне. Ёсьць асобныя настроі, што партыя ў калектывізацыі адступае, сёй-той дадумваецца да таго, што растлумачвае работу, якая праводзілася партыяй за прайшоўшы час, як спробы партыі—эксперымэнт, з якога нічога ня вышла і таму трэба гэту справу адставіць. Учарайшыя загібшчыкі, прыткія «калектывізатары» сёньня апускаюць рукі, нічога ня хочуць рабіць. З такімі настроямі і зьявішчамі трэба павесьці рашучую барацьбу, на іх трэба жорстка біць. Лінія партыі па калектывізацыі ўсіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак застаецца надалей, ніякіх адступленьняў, ніякіх спроб партыя не рабіла і ня робіць. Гэта работа і надалей будзе праводзіцца з тэй-жа рашучасьцю, і наша задача — у практычнай рабоце зьвішчыць тыя памылкі і перагібы, якія былі дапушчаны ў галіне калектывізацыі. Трэба ўстанавіць для ўсіх арганізацый і асобных працаўнікоў абавязковыя правілы пастаяннай работы з беднатой, сапраўднай арганізацыі бядняцка-серадняцкага сялянства, кіраўніцтва ім, не забягаючы ўперад і не адрываючыся ад масы—гэта першая умова, ні ў якім разе не ігнараваць серадняка, прыцягваць яго ў гаспадарчую дзейнасьць, у будаўніцтва калгасаў, не дапускаць разладу паміж калгаснікамі і некалгаснікамі—бедняком і серадняком. Трэба дабіцца дапамогі з боку калгасьнікаў беднаце—не калгаснікам. Сапраўдная работа на прынцыпах добраахвотнасьці, гаспадарчае замацаваньне ісцыўных калгасаў і панава арганізаваных—вось задача дня. Неабходна дабіцца эканамічнага ўрастаньня селяніна-калгасьніка ў калектыўную гаспадарку, лепшай арганізацыі працы ў калгасах, павышэньня прадукцыйнасьці і таварнасьці ў іх. Пры гэтых умовах мы забясьпечым тэмпы і да канца пяцігодкі мы ў асноўным зможам закончыць калектывізацыю бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР. Пытаньне будаўніцтва саўгасаў таксама зьяўляецца пытаньнем вялікай важнасьці, што не заўсёды ўлічваецца многімі партыйнымі і савецкімі арганізацыямі. А між тым саўгасы закліканы ня толькі вырашаць праблему харчаваньня і сырцу, яны адыгралі і яшчэ адыграюць вялікую ролю ў справе калектывізацыі сялянскіх бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак. Гэта роля саўгасаў патрабуе ад іх быць на належнай вышыні ва ўсіх адносінах. Мы за апошнія гады маем вялікае дасягненьне ў будаўніцтве і гаспадарчым замацаваньні саўгасаў. Дасягнулі таго, што яны з дэфіцытных сталі прыбытковымі, пашырылі зямельную плошчу, праведзена значная механізацыя іх, адпак, саўгасы яшчэ не зьяўляюцца тым, чым яны павінны быць, прадукцыйнасьць нізкая, урадлівасьць таксама, з прычыны чаго сабекошт прадукцыі высокі.

Тут праходзіць спэцыялізацыя, яшчэ нізкая таварнасьць, зусім недыстарчальны вытворчы ўплыў на навуковыя калгасы і сялянскія гаспадаркі; не аказваецца матчымая іх дапамога. Па праўдзе кажучы, ня гледзячы на тое, што яны зьяўляюцца гаспадаркамі пасьлядоўна сацыялістычнага тыпу, яны яшчэ не займаюць таго месца, якое павінны займаць. Наша задача—падняць іх на належную вышыню, асабліва зараз, калі мы ў асноўным усе нашы саўгасы пераводзім у фабрыкі мяса, малака і вырабу тэхнічных культур. Адначасова з іх гаспадарчым замацаваньнем трэба ўзяць больш рашучы курс на павялічэньне зямельных плошчаў як шляхам мэліярацыі, так і перадачай запасных фондаў. Трэба дабіцца, каб саўгасы сапраўды зьявіліся прыкладам сацыялістычнага буйнога зямляробства. Трэба даць тыдні лепшых людзей, якія здольны над кіраўніцтвам партыі ажыцьцяўляць пастаўленыя задачы.

Побач з работай па ўздыме ўдзельнае вагі сацыялістычнага сэктару ў сельскай гаспадарцы, мы павінны абгаварыць пытаньне арганізацыйнага парадку, якое таксама мае вялікае значэньне і якое будзе адыгрываць не малую ролю ў далейшым будаўніцтве калектыўных гаспадарак. Зараз дыскусуецца пытаньне аб тым, на што рабіць упор пры арганізацыі калектыўных гаспадарак і якая форма найбольш падыходзячая. Бясспрэчна, што асноўнай формай калектыўнай гаспадаркі зьяўляецца сельскагаспадарчая арцель, бясспрэчна таксама і тое, што мы павінны будзем фарсаваць і арганізацыю таварыстваў па супольнай апрацоўцы зямлі. На гэтым я спыняцца ня буду. Я хачу спыніцца на пытаньні, якое мае два пункты погляду—некаторыя таварышы ў сувязі з тым, што процант калектывізацыі ў БССР ня высокі, прапануюць узяць напрамак на так званы адкрыты калгас, г. зн. што зямля калгасаў ні ў адным месцы, а ў столькіх, колькі ёсьць палеткаў у гэтай вёсцы, угрунтаваўшы гэта тым, што пры далучэньні новых гаспадарак да калгасу будзе менш ломкі пры зямляупарадкаваньні,—па-мойму, нам трэба ня гнаць. Мой погляд, які я высоўваю на абгаварэньне, такі: нам у асноўным трэба ісьці на лінію ўмоўнага канчатковага гаспадарчага ўпарадкаваньня, умоўным я называю таму, што пакуль не калектывізаваны ўсе двары данай вёскі або іх

Перавыбары мясцкомаў саюзу чыгуначнікаў — ВАЖНЕЙШАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ КАМПАНІЯ

Мабілізаваць шырокія рабочыя масы чыгуначнікаў на выкананьне і перавыкананьне заданьняў прамфінпляну на 1930-31 г.

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 11 чэрвеня 1930 г. аб ходзе перавыбараў нізавых прафорганаў саюзу чыгуначнікаў

1. Адзначыць, што падрыхтоўка і ход перавыбараў нізавых прафарганізацый па саюзе чыгуначнікаў не забясьпечваюць выкананьня дырэктывы ЦК ад 8 мая 1930 году аб правядзеньні сапраўднай перабудовы работы прафарганізацый чыгуначнікаў у адпаведнасьці з задачамі і патрэбамі вытворчасьці, вылучэньні новых кадраў рабочага актыву ў нізавыя чыгуначныя прафорганы, разгортваньні ўдарніцтва і сацспаборніцтва, а таксама рашучым павышэньні працдысцыпліны і ўкарэненьні адзінаначальля.

2. Запрапанаваць фракцыі УсеЦСПС, ЦК чыгуначнікаў і мясцовым партарганізацыям дабіцца ў кароткі тэрмін рашучага пералому ў падрыхтоўцы і правядзеньні кампаніі, мабілізуючы шырокія рабочыя масы чыгуначнікаў на выкананьне і перавыкананьне заданьняў прамфінпляну на 1930-31 год з тым, каб забясьпечыць бесьперабойнае выкананьне пляну асеньня-зімовых перавозак (штосутачная нагрузка ня менш 70.000 вагонаў), рашучае змаганьне з прагуламі і «здарэньнямі», узьнімуць працдысцыпліны. Перавыбары прафорганаў па саюзе чыгуначнікаў павінны быць ператвораны ў важнейшую палітычную кампанію і праходзіць пад лёзунгам сьмелага вылучэньня на кіраўнічую работу ў чыгуначныя прафорганы новых кадраў перадавых рабочых-чыгуначнікаў, у першую чаргу ўдарнікаў, забясьпечваючы пры гэтым уцягненьне ў склад выбарных органаў саюзу чыгуначнікаў рабочых з іншых галін прамысловасьці, галоўным чынам, мэталічнай.

3. Запрапанаваць фракцыі ЦК чыгуначнікаў праз мясцовыя чыгуначныя прафорганы ўзгадніць з адпаведнымі ЦК нацкампартый, краявымі і абласнымі камітэтамі партыі канкрэтныя тэрміны перавыбараў па асобных чыгунках і раёнах, выходзячы з сапраўднай падрыхтаванасьці кожнага вучастку. (Перавыбары ў асноўным павінны быць скончаны да 1 верасьня 1930 году).

4. Запрапанаваць мясцовым партыйным, прафэсыянальным і камсамольскім арганізацыям забясьпечыць патрэбную дапамогу саюзу чыгуначнікаў у правядзеньні перавыбарнай кампаніі, у прыватнасьці вылучэньні адказных партыйных, прафэсыянальных і камсамольскіх работнікаў, добрай падрыхтоўкі і інструктаваньня самога партыйнага актыву чыгуначнікаў і не праводзіць мабілізацыі адказных прафработнікаў транспарту на іншыя віды работы ў часе перавыбарнай кампаніі.

5. Абавязаць УсеЦСПС і ЦК саюзу накіраваць ня менш 50, а ЦК УсеЛКСМ ня менш 10 кіраўнічых работнікаў у важнейшыя вузлы і на буйнейшыя заводы для дапамогі ў правядзеньні перавыбараў.

6. Запрапанаваць НКШЗ забясьпечыць сапраўдны ўдзел адміністрацыйна-гаспадарчага і тэхнічнага пэрсаналу ва ўсім ходзе падрыхтоўчай і перавыбарнай кампаніі, у прыватнасьці, узмацніць работу па арганізацыі працы ўдарных брыгад, наладзіць сыстэматычную інфармацыю рабочых аб ходзе выкананьня прамфінпляну (выманьлькі) і забясьпечыць сапраўднае давядзеньне вытворчага заданьня да цэху, брыгады, агрэгату і рабочага. Побач з гэтым абавязаць НКШЗ прыняць неабходныя меры да выкананьня дырэктывы ЦК ад 8 мая аб падцягваньні заработнай платы транспартнікаў да заработнай платы прамысловых рабочых, аб сапраўдным паляпшэньні культурна-бытавых умоў рабочых транспарту і аб задаваленьні іх кватэрамі.

7. Абавязаць цэнтральную («Правда», «Экономическая Жизнь», «Комсомольская Правда», «Труд», «Рабочая Газета») і мясцовую прэсу ўзмацніць асьвятленьне ходу падрыхтоўчай і перавыбарнай кампаніі, як адзін з буйнейшых палітычных задач, разгарнуць сацспаборніцтва на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне перавыбараў паміж асобнымі дарогамі, заводамі, цэхамі, зварачаючы пры гэтым асаблівую ўвагу на буйнейшыя заводы, важнейшыя чыгуначныя вузлы.

Аб пэдагагічных кадрах

(Да выпуску пэдфаку БДУ)

Сёньня мы выпускаем 280 пэдагогаў, якія скончылі Беларускі Дзяржаўны Універсытэт. Гэта лічба выглядае з першага погляду вельмі значнай. Сапраўды выпуск такой колькасьці пэдагогаў зьяўляецца значным нашым дасягненьнем на культурным фронце.

Аднак, гэта лічба ня можа ў той-жа час не навесьці на сумныя думкі аб стане справы падрыхтоўкі пэдагагічных кадраў.

Патрэба ў настаўніках для II-га канцэнтру сямігодкі, тэхнікумаў, прафшкол і рабфакаў вызначаецца ў 930 асоб. Такім чынам, сёньняшні выпуск **здавальняе гэту патрэбу менш, чым на 1/3.** Калі нават дадаць да гэтай колькасьці і датэрміновы выпуск III-га курсу, які адбудзецца ў канцы 1930 г., то і тады нам ня хопіць 356 настаўнікаў.

Але, што горш, у наступным годзе мы будзем мець не паляпшэньне становішча, а значна большае яго пагоршаньне. Выпуск будучага году патрабуе раўняцца 150 студэнтам пры патрэбе ў 1.143 настаўнікаў. Такім чынам, недахват выявіцца ў вялізарнай лічбе — 993 чал.

Такое становішча прымусіла Наркамасьветы паставіць пытаньне аб адкрыцьці ў будучым навучальным годзе 3-х пэдагагічных інстытутаў (у Гомелі, Віцебску і Магілеве) з наборам у 900 чал. са спэцыяльнай задачай падрыхтоўкі кадраў настаўнікаў для II-га канцэнтру сямігодкі.

Калі ўсе пэдагагічныя інстытуты будуць своячасова адкрыты (а яны павінны быць адкрыты ва што-б там ні спала) і вызначаны набор будзе ажыццёўлен у поўных разьмерах, то тады з крызісу мы выйдзем, хаця яшчэ ў 1932-33 годзе нам ня хопіць 207 пэдагогаў.

Усё гэта паказвае, якое ўвагі заслугоўвае справа падрыхтоўкі пэдагагічных кадраў.

А між тым, да апошняга часу гэтаму вучастку аддавалася і аддаецца мізэрная ўвага, у выніку чаго мы стаім перад пагрозай зрыву набору ў пэдагагічныя ВНУ і тэхнікумы ў гэтым годзе.

У нас чамусьці да гэтай пары ня зьнішчаны адносіны да пэдагагічных навучальных устаноў, як да ўстаноў другога гатунку.

У нас да гэтага часу рабочыя амаль што ня ідуць у пэдВНУ і тэхнікумы, у выніку чаго мы маем зусім нездавальняючы ў сацыяльных адносінах склад пэдфакаўцаў. Скончыўшыя рабфакі і курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ (за выключэньнем найбольш сьвядомых) нават і слухаць ня хочуць аб паступленьні ў пэдВНУ.

Такое становішча зьяўляецца зусім нецярпімым. Такія адносіны да пэдагагічнай асьветы супярэчаць асноўным клясавым інтарэсам пралетарыяту.

Хіба ня ясна, што выхаваньне маладога пакаленьня, выхаваньне будаўнікоў сацыялізму ёсьць справа, ад якое залежыць будучнасьць сацыялізму, справа, у якой пралетарыят кроўна зацікаўлен.

Хіба невядома, што **лепшыя** з пралетараў, бяднейшых сялян, калгасьнікаў павінны пайсьці ў пэдагагічныя ВНУ і тэхнікумы?

Хіба ня ясна, што справа апрацоўкі нашай моладзі ва ўсякім выпадку ня менш важная, чым справа апрацоўкі скуры, мэталю, дрэва і г. д.?

З гэтымі агідныміі адносінамі, якія патрабуюць карэннага інтарэсам пралетарыяту, пара пакончыць.

Камсамол павінен разгарнуць вялікую кампанію вярбоўкі лепшай часткі рабочых і беднякоў у пэдВНУ і тэхнікумы. Гэта — гадановаы абавязак камсамолу, за ім тут першае слова.

Партарганізацыі павінны дапамагчы камсамолу ў гэтай справе, яны павінны адначасова забясьпечыць у пэдагагічных ВНУ моцнае партыйнае ядро.

Нашы савецкія органы павінны паставіць пэдагагічныя навучальныя ўстановы ў такія матар'яльныя ўмовы, каб рабочая моладзь магла там сапраўды вучыцца. І ў першую чаргу трэба падтрымаць стыпэндыі пэдагагічных і індустрыяльных тэхнікумаў, аб чым Наркамасьветы прыняў пастанову.

Нарэшце, сёньняшнія выпускнікі павінны стаць агітатарамі за пэдагагічныя навучальныя ўстановы. З вялікім задавальненьнем можам мы сказаць, што большасьць скончыўшых пэдфак ідзе на пэдагагічную работу з вялікім энтузіязмам і любасьцю да справы. Гэты энтузіязм, гэтае разуменьне ролі работы па выхаваньні і адукацыі моладзі яны павінны панесьці ў масы працоўнай моладзі.

Выпускніком гаратае прывітаньне і найлепшыя пажаданьні!

Нам. наркамасьветы Е. РЫЎЛІН.

Больш дапамогі, больш увагі рабочым „25-тысячнікам"

Ні аднаго прадпрыемства бяз сталай сувязі з рабочымі-калгасьнікамі

Прафарганізацыі ігнаруюць важнейшую дырэктыву

Агідныя факты бюракратычных адносін да „дваццаціпяцітысячнікаў"

Бадай усе кіруючыя прафарганізацыі ў сваіх пастановах на пытаньні аб сувязі з «25-тысячнікамі» выказваюць адну думку, што сувязь паміж прафарганізацыямі і вылучэнцамі - калгасьнікамі вельмі слабая. Але ў той-жа час прафарганізацыі ня прымаюць ніякіх рашучых мер да ўзмацненьня гэтай сувязі. Факты фармальных і бюракратычных адносін да «25-тысячнікаў» не сустракаюць рашучага адпору з боку кіруючых прафарганізацый. Між тым, ёсьць факты, якія можна кваліфікаваць, як порстае злачынства.

Заўком Гомельскага заводу «Пралетары» адмовіў жонцы рабочага - калгасьніка выдаць талён па дзіцячыя сандалі.

Старшыня фабкому махорачнай фабрыкі (Віцебск) на запытаньне, ці ведае ён, у якім становішчы знаходзіцца сям'я «25-тысячніка» адказаў — «мы ня біржа працы і не Сабез, нам да гэтага справы няма».

Вось за такія адказы трэба моцна біць, бо яны даволі выразна выяўляюць апартуністычнае нутро заводзкіх прафбюракратаў.

Асабліва многа агідных фактаў наглядаецца ў справе выплаты рабочым-калгасьнікам пэнсіі.

Фабрыка «Дняпроўская мануфактура» плаціць свайму рабочаму - добраахвотніку, які працуе ў калгасе Ларынаўка, зарплату бяз уліку прыработку. Фабкома-ж гэта ня цікавіць. Заводакіраўніцтва гуты «Кастрычнік» (Бабруйская акруга) вельмі нярэгулярна высылае заработную плату сваім «25-тысячнікам», затрымліваючы яе на цэлыя месяцы.

Больш таго. Фабзаўкомы ўхіляюцца ад жывой і пісьмовай сувязі са сваімі вылучэнцамі. Мясцкомы чыгуначнікаў менскага вузлу, фабком менскай шчотачнай фабрыкі, нават, ня ведаюць аб рабоце сваіх вылучэнцаў. Бабруйская АПБ канстатуе, што «сувязь рабочых «25-тысячнікаў» з прадпрыемствамі, за выключэньнем заводу № 6 і заводу «Кастрычнік», дзе заслухоўвалі іх даклады аб рабоце на сходах ячеек і рабочых, амаль адсутнічае. Фабкомы на лісты рабочых не рэагуюць і на запытаньні рабочых пе адказваюць (водпікі, мясцкомы чыгуначнікаў, камбінат інш.)». Рабочы тав. Гарасім, які працуе ў Аршанскай акрузе, скардзіцца, што ён не атрымлівае адказаў на свае лісты ад фабрычных арганізацый «Чырвонай Бярэзіны». Рабочы Сьвяліцкі тры месяцы прасіў арганізацыі віцебскага камтрэсту заслухаць яго інфармацыю аб рабоце пакуль дабіўся згоды.

Вось, што піша рабочая брыгада, якая праводзіла агляд гэтай работы па саюзе гарбароў у Менску: «з боку заўкому заводу «Бальшавік» адсутнічае пастаяннае кіраўніцтва, пісьмовая сувязь ня была наладжана. 1 мая вылучэнец прыяжджаў дамоў, але заўком нават не заслухаў яго інфармацыі». Брыгадзір, які абсьледаваў завод будаўнікоў, піша: «сувязь ЦП саюзу з «25-тысячнікамі» зусім дрэнная». Аршанскае Акрпрафбюро адначае, што большасьці прадпрыемстваў сувязь па фабрычна - заводзкіх, партыйных і прафэсыянальных арганізацый з «25-тысячнікамі» аьяўляецца невыстрачальнай.

Тав. Цімашэнка — рабочы Стайкаўскага лесазаводу некалькі разоў пісаў лісты аб сваёй рабоце, цікавіўся жыцьцём заводу, але адказу не атрымаў. Рабочы менскай чыгункі тав. Пікарскі паслаў два лісты, сам езьдзіў, але ніяк ня можа дабіцца сустрэчы з мясцкомам. Тав. Гарасімовіч — рабочы Бярэзінскай ... у якім прасіла ... ства над камунай ... працуе, але адказу ... на ўсе напрадзіны. Сянкевіч — рабочы ... рыкі некалькі разоў ... зацыю трымаць з ім ... дома, ці чытаў, ... лісты. Тав. Смалянскі ... дальбуду — некалькі ... тым, каб дапамагці ... кі тыя-ж, што і ... выпадках...

Наогул, большасьць ... водзкіх арганізацый ... тыў аб узмацненьні ... сячнікамі» шляхам ... рапіскі, асьвятленьня ... цаў у заводзкіх газетах, аб дапамозе ... сем'ям вылучэнцаў, а таксама за... бесьпячэньня вылучэнцаў усімі ільготамі, якія прадугледжаны законам. Фабзаўкомы не ставяць вакол работы вылучэнцаў палітычнай думкі рабочых калектываў.

Адначасова трэба адзначыць, што і некаторыя «25-тысячнікі» вельмі рэдка пішуць да сваіх фабзаўкомаў або праўленьняў сакзаў.

Усё разам узятае гаворыць пра тое, што сувязь паміж работамі - калгасьнікамі і прадпрыемствамі зусім дрэнная і што прафарганізацыі да гэтага часу не аддалі гэтаму пытаньню выстарчальнай увагі.

Мы чакаем ад ЦСНСВ рашучых мер у адносінах тых прафарганізацый, якія ігнаруюць важнейшыя дырэктывы партыі аб сувязі з «25-тысячнікамі».

В.

Калі адгрымелі трубы

Пытаньні аб правільным скарыстаньні рабочых, пасланых на работу ў калгасы ў ліку «25-ці тысяч» узьнімалася на раз на старонках нашай газэты. Мы ўжо завастрылі ўвагу грамадзкасьці, што на гэтым вучастку ня ўсё ў парадку, што ў радзе месц ёсьць простае ігнараваньне дырэктыў партыйных і прафэсыянальных органаў аб рабоце з «25-тысячнікамі».

На жаль мы прымушаны канстатаваць, што да гэтага часу яшчэ няма патрэбнага пералому ў рабоце з «25-тысячнікамі». Матар'ялы, якія паступаюць з акруг і раёнаў сьведчаць аб тым, што мясцовыя арганізацыі ў радзе выпадкаў ня зусім зразумелі палітычную важнасьць правільнага скарыстаньня рабочых-калгасьнікаў.

Зьвернемся да фактаў. У Дрысенскім раёне, Полацкай акругі, «25-тысячнік» т. **Мамаўраў** скарыстоўваецца выключна на тэхнічнай рабоце. У адным з калгасаў гэтае-ж акругі другога «25-тысячніка» перакідалі доўгі час з аднае работы на другую, підае не скарыстоўвалі на прызначэньні. Нарэшце, у адным з калгасаў яму запрапанавалі: «ідзі, працуй як усе калгасьнікі».

Старшыня Полацкага райвыканкому спаткаў рабочага-калгасьніка т. **Мельнікава** словамі: «Што, таварыш, камісарыць прыехалі?».

Выкарыстоўваньне «25-тысячнікаў» у якасьці хатнікаў, работнікаў спажыўтаварыства і г. д.—даволі частае зьявішча.

Аршанскі райземаддзел на запытаньне акркалгассаюзу, як скарыстоўваюцца «25-тысячнікі» паведаміў, што яны працуюць у якасьці старшынь калгасаў. У сапраўднасьці-ж аказалася, што гэта няверна. Многія рабочыя скарыстоўваліся на тэхнічнай, неадказнай рабоце.

Ляднянскі агра-індустрыяльны камбінат, нават, ня ведае, дзе і хто з «25-тысячнікаў» працуе, сувязі з імі ня трымае.

Мясцовыя партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі мала цікавяцца работай рабочых-калгасьнікаў. Кіраўніцтва з іх боку вельмі слабае.

Характэрна, што многія фабзаўкомы і партыйныя ячэйкі, якія вылучылі «25-тысячнікаў» зусім забыліся пра іх і ня трымаюць з імі ніякай сувязі. Вось некалькі фактаў. Тав. **Мінакер**—рабочы Барысаўскага камбінату, вылучаны ў лік «25-тысячнікаў» некалькі раз прасіў заўком паставіць на агульным сходзе рабочых яго справаздачу аб рабоце ў калгасе. Аднак, т. Мінакер ніяк гэтага ня мог дабіцца.

Тав. **Пякарскі**—рабочы-чыгуначнік станцыі Менск два разы пісаў у мясцком, стараўся наладзіць сувязь, але адказу не атрымліваў, не дапамог і непасрэдны прыезд т. Пікарскага ў Менск. Сыстэматычнай сувязі наладзіць так і не ўдалося да гэтага часу.

Вялікай перашкодай у рабоце «25-тысячнікаў» зьяўляюцца дрэнныя бытавыя ўмовы, слабае забясьпячэньне іх прадуктамі, несваячасовае, а ў некаторых мясцох простая затрымка ў выдачы зарплаты і г. д. Рад мясцовых арганізацый не знайшлі патрэбным паклапаціцца аб стварэньні спрыяючых умоў для работы рабочых-калгасьнікаў.

Рабочы т. **Яндульскі**—член праўленьня Бабруйскага акркалгассаюзу ўвесь час валяецца ў гасьцініцах, заежджых дамох. Ня гледзячы на рад напамінаньняў з боку Бабруйскага акрукому КП(б)Б і акркалгассаюзу, гарсавет на прыняў ніякіх мер для прызначэньня тав. Яндульскаму кватэры. Зразумела, што ў такіх умовах працаваць вельмі цяжка.

У некаторых мясцох «25-тысячнікі» жывуць за 10—15 вёрст ад калгасу, дзе яны працуюць Ня прыходзіцца гаварыць, што пры такіх умовах карысьці ад іх работы вельмі мала.

Як забясьпечваюцца «25-тысячнікі» прадуктамі? У Полацкім раёне спажывецкая каапэрацыя адмаўлила ім у водпуску прадуктаў:

— Вы ня пайшчыкі, таму ня можаце атрымліваць у нас прадуктаў.

Толькі пасьля ўмяшальнасьці раённых арганізацый удалося дабіцца забясьпячэньня рабочых - калгасьнікаў (1 то нипоўнага) патрэбнымі прадуктамі.

Старшыня Лоеўскага спажывецкага таварыства проста выгнаў са свайго кабінэту рабочга-калгасьніка, які зьвярнуўся да яго з просьбай аб водпуску прадуктаў.

Бюракратычныя адносіны да сямей «25-тысячнікаў» маюць месца ў радзе раёнаў і акруг.

Жонка рабочага т. **Макарэнка** (станцыя Гомель) зьвярнулася ў мясцком з просьбай, каб ёй дапамаглі, але там яна атрымала такі бюракратычны адказ:

— Ваш муж працуе ў калгасе, нихай там і атрымлівае дапамогу.

Жонка рабочага-калгасьніка т. Захарава зьвярнулася ў мясцком з просьбай аб пасылцы на работу. Замест канкрэтнай дапамогі ёй груба адказалі: «ваш муж працуе ў калгасе, таму вам няма чаго сюды хадзіць».

Зусім невыдакладна некаторыя рабочыя-калгасьнікі скардзяцца: «мы сталі для арганізацый, якія нас паслалі ў калгасы, зусім чужымі».

Аб цяганіне з выдачай «25-тысячнікам» зарплаты ня раз ужо пісалася. Аднак, пакуль што гэтыя ненармальнасьці ўсё яшчэ маюць месца.

Старшыня калгасу «Авангард» (Лепельскі раён, Полацкай акругі)—рабочы заводу «Труды»—на працягу 3½ м. не атрымліваў зарплаты ад заводакіраўніцтва. Рабочы тагож заводу т. Пашкевіч не атрымлівае зарплаты ўвесь час. Рабочыя, камандыраваныя з заводу «Кастрычнік» (Бабруйшчына) сыстэматычна не атрымліваюць зарплаты ад заводакіраўніцтва. Есьць рад выпадкаў затрыманьня зарплаты на цэлыя месяцы. Завод «Калектыўная Праца», завод імя Ланцуцкага, «Інтэрнацыянал», фабрыка «Возуві» і інш. ня цікавяцца рабочымі-«25-тысячнікамі, якіх яны самі-ж паслалі на работу ў калгас.

Трэба сказаць, што ў асноўным «25-тысячнікі» спраўляюцца з узятымі на сябе абавязкамі і правямі вялізную работу ў калгасах.

Трэба дабіцца рашучага пералому на гэтым важнейшым участку. Неабходна паставіць работу «дваццаціпяцітысячнікаў» ў такія умовы, каб яны маглі поўнасьцю выканаць задачы, ускладзеныя на іх партыяй, каб яны мелі матэрыяльнасьці, працаваць нармальна, каб яны маглі стаць сапраўднымі будаўнікамі сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

С. Г-п.

Насустрач новаму хлебу

Неадкладна разгарнуць гаспадарчую і палітычную падрыхтоўку да хлебазагатоўчай кампаніі

Своячасова падрыхтавацца да загатовак

БССР з перавышэньнем выканала ў гэтым годзе плян загатовак збожжа. З асаблівым посьпехам прайшоў збор гарапцу, які даў па 87,5 проц. больш, чым мінулы год.

Калі меркаваць па падставе матар'ялаў Наркамзему і ЦСУ, праектуецца павышэньне валавога збору збожжавых культур у будучым годзе супроць гэтага на 110,9 проц. Выключнае значэньне набывае зараз пытаньне пляпаваньня прыёмкі збожжа, разьлікаў за яго і забясьпячэньня пляпавых здатчыкаў прамысловымі таварамі.

Неабходна ўжо зараз перастроіць рады загатоўшчыкаў збожжа, перагледзець да самых дробных дэталяй усе арганізацыйныя, гаспадарчыя пытаньні кампаніі.

Мэтад давядзеньня пляну да калгасу і вёскі поўнасьцю апраўдаў сябе. **Трэба, каб не пазьней 20 ліпеня плян загатовак быў абгавораны калгасамі і неналектывізаванымі вёскамі.**

Трэба адзначыць, што **дагэтуль мала ўвагі зьвернута на пытаньне падрыхтоўкі тэхнічнай базы.** Саюзхлеб несваячасова атрымлівае патрэбныя для будаўніцтва складаў матар'ялы, у сувязі з чым парушаюцца вызначаныя тэрміны пабудовы. Між тым, трэба да пачатку новай загатоўчай кампаніі пабудаваць склады на 4.000 вагонаў. Трэба пасьпяшыць з пабудовай складаў яшчэ і таму, што ў гэту кампанію значная колькасьць таварнага збожжа саўгасаў, якія ня маюць складаў для хаваньня збожжа, адразу-ж пасьля ўборкі рушыцца да станцыі і прыстаняй. Такім-жа тэмпам будзе паступаць збожжа ад калектыўных гаспадарак, бо калгасы пасьля абмалоту ня будуць разводіць збожжа на дварох асобных членаў, а адразу-ж зьвязуць на станцыі і прыстані тую частку збожжа, якую трэба здаць дзяржаве па кантрактацыі і па дагаварох з сыстэмай сельска-гаспадарчай каапэрацыі. Зразумела, што ў першыя-ж месяцы паўстане пытаньне аб разгрузцы складаў станцый і прыстанцый.

Саюзхлеб упяршыню ў БССР у мінулым годзе разгарнуў сушку збожжа. Дзьве збожжасушылкі прадукцыйнасьцю ў 4.000 п. у 2 зьмены значна дапамаглі захаваньню збожжа ад псаваньня.

Трэба і зараз у Гомелі, Воршы прыступіць да рамонту збожжасушылак, але гэтага мала. Саюзхлеб узьняў пытаньне аб набыцьці для беларускай канторы 6 збожжасушылак. Такім чынам, працаваць навіны будуць каля 9-10 збожжасушылак.

Яшчэ большае значэньне будзе мець сушка збожжа, калі прыняць пад увагу значны завоз кукурузы для прамысловых мэт і для ўзмацненьня кармавой базы (кукуруза мае да 25 проц. вільготнасьці).

Выключнае значэньне ў справе падрыхтоўкі да загатовак збожжа мае пытаньне забясьпячэньня складаў вагамі, тарай і іншым інвэнтаром. Дагэтуль ня выяўлена, колькі інвэнтару патрэбна. Трэба зараз-жа заказаць вагі на мэталяапрацоўчых заводах і неадкладна прыступіць да рамонту тары.

Кароткаў.

Арганізацыі хаваюць тару

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Дрэнна абстаіць справа з тарай пад збожжа. Ня гледзячы на неаднаразовыя звароты «Саюзхлеба» да адпаведных арганізацый аб адачы тары, арганізацыі не разварушыліся і хаваюць у сябе тару. З прычыны нядбайнасьці арганізацый, «Саюзхлеб» ня можа прыступіць да рамонту мяшкоў і тэтым забясьпечыць выгрузку збожжа.

Неабходна дабіцца правільнага скарыстаньня перавозачных сродкаў — правесьці ўлік усяго аўта-гужтранспарту, арганізаваць канвэйерныя бюро для правільнага разьмеркаваньня транспарту і неадкладна прыступіць да добраахвотных рабочых брыгады ў дапамогу збожжа загатоўчым арганізацыям.

С. С.

Усе на рабочую МАСОЎКУ Кастрычніцкага раёну.

Кастрычніцкі раённы камітэт партыі і ЦСПСБ

СКЛІКАЮЦЬ 29-ГА ЧЭРВЕНЯ Г. Г.

роўна а 6-й гадзіне ўвечары, у садзе „Профінтэрн"

шырокую рабочую масоўку,

прысьвечаную вынікам XIII зьезду КП(б)Б і задачам XVI зьезду УсеКП(б)

З дакладам выступіць тав. РЫЎЛІН.

Пасьля дакладу адбудзецца вялікая мастацкая частка.

Уваход па білетах, разданых фабзаўмясцкомамі.

Кастрычніцкі РК КП(б)Б і ЦСПСБ.

Нататкі з саўгасу

Шляхам перамог

I. Адміраючы трафарэт, вясна Кастрычніка і нараджэньне Янова

Звычайна нарысы пра жыцьцё і працу савецкіх гаспадарак пачынаюцца апісаньнем прыгожасьцяй запушчанага парку, анфіляды былых барскіх пакоў, апавяданьнем пра тое, як некі пан калісьці гнаў сем патоў са сваіх прыгонных і як цяпер тамака квітнее вольная і ўзорная работа.

Гэтая, па сутнасьці ня шкодная тэндэнцыя прасякнула і ў мастацкую літаратуру. Але радкі паэты:

«Быў калісь маёнтак,
А цяпер саўгас
Зараз літаральна набілі аскоміну.

Як быццам нямашака новых цікавых будынкаў і расьлін у нашых саўгасах узьведзеных і пасаджаных за апошняе дзесяцігодзьдзе.

Нарыс пра саўгас Янова пры ўсім жаданьні цяжка было-б распачаць устаноўленым трафарэтам.

Апошні арэндатар сядзібы графоў Талстых пан Кальмэер пакінуў у спадчыну маладому краю трухлявы аднапавярховы дом і... нуль інвэнтару. Здарылася так мажліва таму, што пан Кальмэер болей піў, як наглядаў за гаспадаркай, а мажліва і таму, што незадоўга да Кастрычніка яго задушыла збожжам абваленая ў сьвірні столь. Пасьля-ж сьмерці Кальмэера аж да ўзьнікненьня саўгасу ўсё кацілася ўніз.

Была вясна рэвалюцыі асеньня-бурапенныя, блёкадныя, галодныя—месяцы васемнаццатага. Заснаваўся саўгас.

Рабочыя жылі ў насьпех скалочаных хлёвах, дрыжэлі ў лютыя марозы. Усю гаспадарку абдуводвалі панава.

І творчы імпэт памножаны на жалезную волю, даў свае вынікі.

Цяпер паўраўнальна невялікі саўгас (850 гэкт. зямлі, 300 галоў жывёлы—прыклад і дапамога калектыўным і адзіночасобным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам раёну.

Яго наведваюць шматлікія экскурсіі, ён зьвязаны шэфствам з навукольнымі калгасамі.

II. Харастро мясцовасьці мімаволі захапляе...

Лірычнае адступленьне тутака не на рочы... Але папрабуй не захапіцца буйнай сакавітай прыгожасьцю шумрудных руняў, пэзтычным стаўком, «графскім вірам», ліпавай алеяй са стагодніх дроў, у два-тры чалавечыя абхваты.

Разьмешчанае ў адным кілёмэтры ад гораду Чавус гэтае месца спакон вякоў служыла ўлюбёным месцам сустрэч і гулянак для моладзі.

Рака Бася робіць тут круты загіб—амаль тры чвэрце круга—ствараючы свае асаблівую лагуну ці бухту, накрытую белымі ліліямі з квола-ружовай сярэдзінай. Іх—безьліч. Адхоны дзьвюх гор, на якіх месьцяцца галоўныя ўладаньні саўгасу (яго «філіялы»—яшчэ Паўлаўка і Вяпілы, за колькі кілёмэтраў) вабяць зеляніною збожжа, хвалюцца пад ветрам і шалясьцяць—радасна і няўёмна. Паміж адхонаў тырчыць срабрысты раўчак. Стары горад (які горад?—звычайнае пыльнае мястачка) у сьвяточныя дні хаваецца па Ялавым ад сьпякоты, бруду і плётак.

... Вунь у кустох дубняку і алешніку мільгацяць віхрастыя галоўкі акцябрат і піянэраў. А вось, пад шатамі раскідзістых ліп, дарогай цяністай і прыемнай, ідуць паволі ён і яна... Ім абодвым даўно пераваліла за сотню год. Крокі здаюцца важкімі і глухімі... Вабіць гаражан Янова.

III. Факты гаворяць самі за сябе

Мы сядзім з загадчыкам саўгасу тав. Арцюхом на ганку будынку канторы.

— Ураджаі ў нас добрыя, гаворыць тав. Арцюх, летась здалі райкалгассаюзу 16 тысяч пудоў рознага пасеўнага матар'ялу. Аднае чыстагатункове бульбы—7 тысяч пудоў. Веснавую сяўбу сёлета мы скончылі на два тыдні раней тэрміну, з пашырэньнем ілошчы супроць мінулага году на 25 проц. Гэта за кошт бросавых зямель і папару.

Увосень мы мяркуем здаць для калгасаў раёну 7.000 пудоў чыстагатункова жыта. Аграмінімум выкананы поўнасьцю. Значна павялічаны сёлета засеў коранялодаў і бульбы. Заваплавана 40 гэкт. яравых культур і на 50 гэкт. пракладзены гной.

Я ледзь пасьпяваю запісваць.

Аказваецца, што за апошні год саўгас мае многа дасягненьняў.

Абсталяваны добра масларобчы завод. За май месяц ён здаў магілеўскаму ЦРК і Белрабсэкцыі 60 пудоў масла. Усе работы ў Яловым—у асноўным на зьдзельшчыне. Ёсьць шмат машын—касаркі, жнівяркі і інш. Саўгас электрафікаваны.

Створаны сярод рабочых (а іх разам з сэзоньнікамі 58 чалавек) ударныя брыгады. Паводле ўмовы на сацыялістычнае спаборніцтва з бліжэйшым саўгасам Вейна ёсьць рэд паляпшэньняў у работе і быце. Рэгулярна выдаецца насьценгазэта.

— Зразумела, што ўсе нашы посьпехі былі магчымы толькі таму, што ў саўгасе шчыра і самааддана працуюць партыйная і камсамольская ячэйка, кажа т. Арцюк.

IV. Гутарка з чалавекам, які працаваў на пана

Губкоў Апанас чалавек, можна сказаць, не стары... У яго—цьмяная барада лапаткаю—дзе-ні-дзе сівы волас—глыбока запаўшыя вочы, худзенькая нязграбная постаць.

— Даўно працуеце, дзядзька?

— Ды гадоў шашнаццаць у гэтай мясьціне... Раней—на Урале быў, у Сібіры... Толькі пры панох тут гады тры пакутваць прышлося...

— Нешта-ж «пакутваць»?

— А працавалі ад 4 гадзіны да 9 ураньні (з перапынкам, значыцца), а тады ад 9-й да 8-й вечару амаль без перапынку... Вось... За 15 рублёў у месяц. Цяперака? Цяпер усё добра... У месяц выходзяць рублі 32-34. І гадзіны пэўныя... Хіба, што памяшканьняў бракуе...

У размову ідзе матка Апанаса—жанчына сівая і слабенькая:

— А паны жылі—ку-уды як! Чаго толькі ня выраблялі ў маёнтку сваім... Памятаю—графы з вакна двухпавярховага дому ажно да рэчкі каток утварылі... Драўляная гара, з дошак, а на версе лёд... Сажняў на сто з гакам. Ну, і на канькох, з вакна другога паверху...

Ад яе цяжкіх мерных слоў веё мінулым стагодзьдзем, прытонным праваи, бясчынствамі абшарнікаў. А слухаць цікава. Жывая гісторыя. Але тав. Арцюк не дае затрымацца ў Губковых:

— Трэба агледзець стайню... Там арлоўскія рысакі—нешта асаблівае.

V. У пэрспэктыве—пэўны вытворчы напрамак

З гэтага году Ялова набывае суровавытворчы ўхіл—сьвінагадоўлі.

Гаспадарка перадаецца ўсесаюзнаму Сьвінаводтрэсту.

Увосень распачнецца будоўля сьвінухоў на 225 матак і 600 падсьвінкаў на адкорм.

Паступова лік сьвіней у гэтым саўгасе будзе даведзены да 3.000 галоў. Таму і пашыраецца ўжо сёлета засеў бульбы і коранялодаў.

З працягам часу Ялова зробіцца буйнейшым і найбольш прадукцыйным саўгасам на Магілеўшчыне.

VI. Больш увагі саўгасу

Можна падумаць, што ў Чавусах (ды і ня толькі ў Чавусах) забыліся на тое, што практыка гаспадарчае і культурнае работы саўгасу Янова набывае вялікае значэньне ў справе перабудовы сельскае гаспадаркі раёну на новы, сацыялістычны лад.

У саўгасе, скажам, вострыя жыльлёвы крызіс. Пытаньне гэта тройчы абгаворваецца на прэзыдыуму РВК. Адпускаюцца Белсельтрэстам 100 тысяч рублёў на жыльлёвае будаўніцтва.

А воз—ні а месца...

Надышоў будаўнічы сэзон. А рабочых-сэзоньнікаў няма куды разьмясьціць. Упчыньненьне перавысіла меру.

Ад саўгасу форменным чынам адбіраюць адзіны ва ўсім раёне трактар. Раённая партыйная канфэрэнцыя рашучым чынам апратставала гэты ўчынак. Але покуль што Чавускі райкалгассаюз бяз трактара і ў Ялове пельга ў дадатак да ўсяго, пусьціць у ход складаную малатарню.

Грамадзкасьць раёну неяк індыфэрэнтна адносіцца да саўгасу і ён павінен варыцца ва ўласным саку.

* * *

Пад вечар пакідаем саўгас. Пакідаем ў цьвёрдай пераконанасьці ў яго новых перамогах. За іх галасуе жыцьцё і шчырасьць саўгаскага калектыву. Ваганьняў няма. За гарой хаваецца чырвоны дыск сонца і веяр праменьняў яго рассыпаецца адвітальным салютам.

На раёнскі чуён рытмічны ўсплеск вёслаў. Зьвініць юнацкая песьня. Гэта—кам самолія.

Юрка Лявонны.

Аргінізацыі хаваюць тару

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Дрэнна абстаіць справа з тарай пад збожжа. Ня гледзячы на неаднаразовыя звароты «Саюзхлеба» да адпаведных арганізацый аб адачы тары, арганізацыі не разварушыліся і ха

ЗПАР ПланСкан А2В

(ліпень-сьнежань)

ПАСЬПЯШАЙЦЕСЯ З ПАДПІСКАЙ на 2-е ПАЎГОДЗЬДЗЕ 1930 г.

(ліпень-сьнежань)

НА СТАРЭЙШУЮ ШТОДЗЕННУЮ ГАЗЭТУ—ОРГАН ЦК КП(б)Б

„ЗЬВЯЗДА“

Усе матар'ялы, справаздачы і рэзалюцыі XVI ЗЬЕЗДУ ПАРТЫІ будуць цалкам зьмяшчацца на старонках газэты „Зьвязда“.

Усе падпісчыкі газэты „ЗЬВЯЗДА“ дармова атрымліваюць дадатак Орган ЦСПСБ „ПРАФРУХ БЕЛАРУСІ“ Орган ЦСПСБ

Падпісная цана на „ЗЬВЯЗДУ“ з дадаткам „ПРАФРУХ“ застаецца ранейшая:

6 мес.—5 р., 3 мес.—2 р. 60 к., 1 мес.—90 кап.

Дарогу рабочай здагадцы

Бяздушная, фармальная дапамога

Бюро рабочага вынаходніцтва пры ВСНГБ заклікана дапамагчы творчай думцы рабочага, але бюро ня выконвае гэтага абавязку. Замест дапамогі мы маем у лепшым выпадку сухую, фармальную, бяздушную кансультацыю. Вынаходца прынёс нагодны чарцёж. Яму заяўляюць, што чарцёж нягодны і прапануюць перапрацаваць яго. Ніхто не задумваецца над тым, ці можа рабочы справіцца з гэтай задачай.

Толькі ў апошні час у бюро зьявіўся чарцёжнік, які тэхнічна афармляе каравыя эскізы рабочых-вынаходцаў. Няма ўліку прапаноў. Праўда, кансультант бюро Роман вядзе запіс вынаходцаў і іх прапаноў у... сваёй запісной кніжцы, але гэта ён лічыць сваёй прыватнай справай.

Як выявіла брыгада па абсьледваньні ВСНГБ, рад каштоўных прапаноў рабочых не рэалізаваны дагэтуль. Фонды садзейнасьці рабочаму вынаходніцтву амаль не скарыстаны—у рэдкіх выпадках выдаваліся мізэрныя прэміі.

Ніхто з вынаходцаў ня ведаў і не карыстаўся тэхнічнай бібліятэчкай бюро. А яна магла-б прынесьці карысьць рабочаму-вынаходцы.

Ніякай ініцыятывы работнікі бюро не праявілі. Міма іх прайшоў усесаюзны агляд вынаходцаў. Ні разу ня была склікана канфэрэнцыя вынаходцаў.

Такавы сумныя вынікі работы бюро. Треба моцна страсянуць, каб ажывіць работу бюро.

К-н.

Скрозь густы лес цяганіны

Нядаўна ў Бабруйску і ў Гомелі адбыліся нарады па вынаходніцтве. Апрача таго, што на нарады зьявілася мала людзей—у Гомелі замест 200 чал. толькі 65, у Бабруйску—25-30 чал., характэрна, што гаспадарнікі зусім ня лічылі патрэбным наведаць нарады,—прышлі толькі 2-3 чал., ня было на нарадах і прадстаўнікоў інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу.

Гэтыя даныя даволі выразна гавораць аб недапушчальных адносінах да рабочага вынаходніцтва.

Аб чым гаварылі вынаходцы?

На большасьці прадпрыемстваў зусім няма камісій садзейнасьці рабочаму вынаходніцтву, а там, дзе яны ёсьць,—вельмі слаба працуюць. Справы аб вынаходках марынуюцца месяцамі і гадамі. На кожным кроку вынаходцы сустракаюцца з інэртнасьцю, кансэрватызмам адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу.

Калі рабочы прапануе вынаходку, амаль ніхто не бярэцца за рэалізацыю яе, не вызваляюць яго ад работы, ня пускаюць у лябараторыю, не дапамагаюць пабудаваць мадэлі. Яшчэ амаль няма ніводнага факту, калі-б органы судовага нагляду прыцягвалі да адказнасьці за цяганіну ў справе рэалізацыі вынаходак.

На нарадзе прывялі прыклад, калі рабочы гомельскага заводу «Пралетары» Звагельскі прапанаваў генэратар для аўтагеннай зваркі, які, па думцы вытворчай нарады, павінен даць 4.000 руб. эканоміі ў год.

На заводзе над Звагельскім толькі сьмяяліся, а яго прапанова зараз вандруе ад адной установы да другой.

На нарадах прывялі шмат прыкладаў цяганіны, казённых адносін да рабочага вынаходніцтва.

Высьветлілася, што кіраўніцтва вынаходніцтвам культае на абедзьве нагі. Няма ўліку вынаходцаў і іх прапаноў. Амаль няма гуртку для вынаходцаў. Ніхто не займаецца вучобай і павышэньнем кваліфікацыі. Інжынэрна-тэхнічны пэрсанал не дае вынаходцам належнай тэхнічнай дапамогі.

Друк, які ўзяў шэфства над рабочымі-вынаходцамі, не маблізуе мас на барацьбу за добрыя адносіны да рабочых прапаноў.

У гэтай справе, падкрэсьлілі ўсе выступаўшыя, треба дабіцца рашучага пералому.

ІЗАКАЎ.

Барацьба нізавога друку за паперу

Рабкоры і насьцёнкоры папяровых прадпрыемстваў БССР павінны быць у першых радох прывядзеньня агляду спаборніцтва

З 1-га ліпеня праводзіцца ва Ўсесаюзным маштабе агляд спаборніцтва нізавога друку ў барацьбе за паперу.

Гэтая кампанія праводзіцца з мэтай выяўленьня таго, наколькі нізавы друк (друкаваная шматтыражка і насьценная газэта) папяровай прамысловасьці змагаўся і змагаецца за перавыкананьне крамфінпляну на папяровых прадпрыемствах Савецкага Саюзу.

У часе правядзеньня кампаніі агляду спаборніцтва нізавому друку трэба будзе завастрыць увагу на наступных момантах:

на змаганьні за рацыяналізацыю ў рэканструкцыі папяровай прамысловасьці і на ўзмацненьні рацыяналізатарскай работы пры разгортваньні новага капітальнага будаўніцтва;

на павышэньні прадукцыйнасьці працы, на зьніжэньні сабекошту на палепшэньні якасьці прадукцыі, выдучы барацьбу з бракам і стратамі;

на забесьпячэньні папяровай прамысловасьці сырцом, утыльсырцом, матар'ялямі, запаснымі часткамі і абсталяваньнем в боку іншых гаспадарчых арганізацый;

на лепшай арганізацыі рабочага забесьпячэньня з мясцовых крыніц і на палянішэньні культурнага абслугоўваньня рабочых-папярнікаў.

Бязумоўна, што ў гэтым аглядзе нізавы друк папяровай прамысловасьці павінен заняць цэнтральнае месца.

Нізавы друк арганізуе на мясцох ва ўдарным парадку **вытворчыя агляды, перакліч; узмацняе апэрацыйнае кіраўніцтва змаганьнем за прамфінпляц (зводкі, чырвоныя і чорныя дошкі); арганізуе агляд працы рабкораў на фабрыках і заводах.**

Нізавы друк кіруе цэхавымі газэтамі, максымальна скарыстоўваючы «цэхаўкі» ў змаганьні за прамфінплян, пляхам асьвятленьня іх работы на старонках друкаванай газэты.

На мясцох праводзяць агляд спаборніцтва рэдкалегіі газэт. Пры іх стваравацца камісіі садзейнічаньня аглядзу ў складзе прадстаўнікоў рэдкалегіі заводзкага камітэту, ячэйкі, прадстаўнікоў адміністрацыі, ІТС, ударнікаў.

Задача камісіі садзейнічаньня заключаецца ў тым, каб арганізаваць, дапамагчы газэтам у правядзеньні на мясцох аглядаў адпаведна задачам аглядзу, у зборы і рэалізацыі прапаноў рабочых аб выкананьні прамфінпляну, у змаганьні за дасягнасьць аглядавых прапаноў.

Сканчэньне аглядзу прысьвечана дакладу гаспадарчага году—1-га кастрычніка.

Для правядзеньня кампаніі аглядзу спаборніцтва па Беларусі пры «Зьвязьдзе» ствараецца штаб кіраўніцтва, аб складзе якога будзе паведамлена дадаткова.

ЦУДЗІН.



Пабудова новай цэнтральнай бібліятэкі ў Менску.

МЕНСК

Зварот атраду асоавіяхіму з летніх лягераў

Гэтымі днямі з летніх лягераў у Менск варочаецца першы атрад Асоавіяхіму ў ліку 40 чал. Пасьля гэтага атраду ў лягеры на 10 дзён выходзіць другі атрад Асоавіяхіму.

Пленум ЦП саюзу гарбароў

27 ліпеня ў Менску склікаецца пленум ЦП саюзу гарбароў, на якім будуць разглядацца пытаньні — аб выніках перавыбараў ФЗМК саюзу і аб чарговых задачах саюзу гарбароў, аб выніках работы Белскураб'яднаньня і Белшчаціны за трэці квартал і кантрольных лічбах на 1930-31 г. і аб падыходзячай кампаніі перазаключэньня калектыўных дагавароў.

Паўторная самаправерка

З прычыны малой актыўнасьці рабочых пры правядзеньні самаправеркі сацспаборніцтва на фабрыцы «Дняпро», ЦП саюзу хэмікаў пастанавіла правесьці паўторную самаправерку на фабрыцы.

Новыя дзіцячыя ясьлі

Да дня 10-годзьдзя вызваленьня БССР ад белапалякаў пры менскіх ЖАКТ'х, клюбах і прадпрыемствах будзе адкрыта каля 300 новых ясьляў.

Фізкультурнікі на дапамогу калгасьнікам

30 чэрвеня ў падпэфны Заслаўскі раён выяжджае брыгада фізкультурнікаў - студэнтаў Беларускага тэхнікуму фізкультуры, якія будуць прапрацоўваць з калгаснікамі тэзісы XVI партыйнага зьезду і правераць становішча фізкультурнай работы ў калгасах.

Павялічыць лік хавальнікаў гародніны

У зьвязку з тым, што існуючыя хавальнікі гародніны, разьлічаныя на 2.000 тон гародніны, ня могуць задаволіць патрэбу Менску, прэзыдыум гарсавету запрапанаваў МЦРК павялічыць ёмкасьць хавальнікаў да 4.000 тон, паставіўшы новыя будынкі.

Падрыхтоўка да асеньняй уборачнай кампаніі

Аргаддзел ЦСПСБ, сумесна з РСІ, прыступае да праверкі ходу падрыхтоўкі да ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі. Для гэтай мэты арганізуюцца брыгады рабочых, якія выяжджаюць у калгасы і саўгасы.

Курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ

Пры ЦП саюзу саўгандальслужачых арганізаваны 3-месячныя курсы на падрыхтоўцы рабочых у ВНУ. На курсы прыняты 50 чал.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

ЗАЎТРА

Дом Асьветы. А 7 гадз. веч. адбудзецца адкрыты сход партканлектыву КП(б)Б працасьветы. У нарадку дня: вынікі XIII зьезду КП(б)Б. Запрашаюцца асьветнікі.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

Палітэхнікум. У памяшканьні палітэхнікуму (аўд. № 2) адбудзецца сход усіх студэнтаў усіх аддзяленьняў палітэхнікуму і вачэрняга рабочага тэхнікуму, якія знаходзяцца ў Менску, па пытаньні аб удзеле студэнтаў у падрыхтоўцы да прыёму ў 1930-31 навуч. годзе. Яўка абавязкова. Пач. а 7 гадз. веч.

БДУ. Прафком пэдфаку паведамляе студэнтаў, якія ідуць у лягеры і адъяжджаюць на летнія вакацыі, што калі яны маюць патрэбу ў матар'яльнай дапамозе, павінны падаць у прафком заяву да 28-VI.

Саюз Белпрацасьветы. Экскурсія па маршруце Менск — Ленінград, якая была прызначана на 2 ліпеня, паводле атрымання паведамленьня ад ЦК саюзу, пераносіцца на 15 ліпеня. Удзельнікі экскурсіі павінны зьяўляцца ў Менск не 2 ліпеня, а 15 ліпеня.

ЦСПСБ. Культмасавы сэктар ЦСПСБ адкрывае для дапамогі гуляючым у рэспубл. маштабе на перапісцы шахматна - шаночнага кансультацыі на гарбарні «Бальшавік», абутковай, шчотачнай і шчаціннай фабрыках і ў садзе Працасьветы. Цэнтр ш.-ш. у клюбе харчавікоў па цотных ліках.

АД МЕН. АКК КП(б)Б

Мен. АКК выклікае на 27-VI 30 г. а 18 гадз. веч. для разбору партспраў наступных таварышоў:

Лойна М. В. — (яч. гарбарні «Бальшавік»); Барашылаў А. Р. — (яч. БСНГ); Севасьцянаў М. — (яч. сл. шляху МБВ); Сівец Г. В. — (яч. заав. «Камінтэрн», Барысаў); Зінчук П. — (Сл. Руху Таварная МБВ); Гольдмана А. А. — (яч. Белсамрамсаюзу); Селяньцёва Р. І. — (яч. 5 разьдзелу Аховы. МБВ); Рашал Х. М. — (яч. шчотачн. фабр.); Васілеўская В. — (Чыгун. вузел МБВ, Барысаў); Карчэўская І.— (Ф-ка «Прафінтэрн», Барысаў); Чыжа С. А. — (Фабр. Меншвэй); Рудзінская А. П. — (яч. Белкаапсаюзу); Фрыдмана Р. М. — (яч. гарб. «Бальшавік»); Яшыну М. В. — (яч. гуты «Пралетары»); Табачнікава І. Я. — (Самахвалаўскі раён); Цяплова П. В. — (16 П/О АДПУ); Савінкага В. П. — (16 П/О АДПУ).

Акрамя названых таварышоў павінны зьявіцца абавязкова сакратары парт'ячэек тых, да якіх належаць выклікаемыя таварышы, а таксама старшыні праверкому, што праводзілі чыстку гэтых ячэек.

Рэдакцыя газэты «Чырвоная Зьмена», Мен. АК ЛКСМБ, ВСНГБ і ЦСПСБ склікаюць 26-та чэрвеня, а 7-й гадз. увечары ў памяшканьні залі пасяджэньняў Мен. АК КП(б)Б нараду прадстаўнікоў гаспадарчых аб'яднаньняў, усіх ЦП саюзаў, Наркампрацы, Галоўсацстраху, прадстаўнікоў гаспадарчых і прафэсыянальных арганізацый наступных прадпрыемстваў: «Энэргія», «Камунар», «Бальшавік», «Кастрычнік», абутковай фабрыкі, «Дрэваапрацоўшчык», «Чырвоная Зорка», «Камунарка» і «Беларуска».

Па пытаньні:

Арганізацыі лягеру «пятага дня ўдарніка» у садзе «Прафінтэрн».

Просьба зьявіцца без спазьненьня.

— 25-та гэтага месяца а 7-й гадз. увечары ў памяшканьні школы № 7 па Камсамольскай 38 склікаецца агульны сход членаў і жыхароў ЖАКТ'а № 11. У сувязі з важнасьцю пытаньняў яўка ўсіх членаў і жыхароў ЖАКТ'а абавязкова без спазьненьня.

ПРАЎЛЕНЬНЕ ЖАКТ'а № 11.

ДА АСЕНЬНЯГА ПРЫЁМУ У ВНТУ

БЕЛАРУСКІ ПАЛІТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ

(гор. Менск, Земляробчы зав., д. № 4)

АБВЯШЧАЕ,

што ў 1930-31 навучальным годзе будуць існаваць наступныя факультэты.

1. Хэміка-тэхналёгічны з аддзяленьнямі:
а) харчовае,
б) сілікатнае,
в) тарфянае,
г) лесахімічнае.

2. Мэханічны з аддзяленьнямі:
а) халодная апрацоўка ільну,
б) варштатабудаўніцтва,
в) лесамэханічнае,
г) першапачатковая апрацоўка валакністых матэрый.

3. Электратэхнічны з аддзяленьнямі:
а) прамысловая электрафікацыя,
б) сельская электрафікацыя,
в) электрастанцыі.

4. Будаўнічы з аддзяленьнямі:
а) фабрычна-заводзкае будаўніцтва,
б) калгаснае будаўніцтва,
в) жыльлёвае будаўніцтва,
г) дарожнае будаўніцтва,
д) санітарнай тэхнікі.

Прыём першай чаргі будзе адбывацца ў жніўні месяцы.

I. На хэміка-тэхналёгічны факультэт:
1. Харчовая спэцыяльнасьць (перапрац. с.-г. прадукцыі . . 30 чал.
2. Сілікатная спэцыяльнасьць (шкло) . . . . . 15 чал.
3. Тарфяная спэцыяльнасьць (хэміка-прам. перапрацоўка торфа) . . . . . 15 чал.
Усяго . 60 чал.

II. На мэханічны факультэт:
1. Варштатабудаўніцтва . . . 15 чал.
2. Халодная апрацоўка моталяў 15 чал.
3. Мэханічная апрацоўка валакністых матэрый . . . . . 20 чал.
Усяго . 50 чал.

III. На электратэхнічны факультэт:
1. Прамысловая электрафікацыя . . . . . 15 чал.
2. Сельская электрафікацыя . 15 чал.
Усяго . 30 чал.

IV. На будаўнічы факультэт:
1. Фабрычна-заводзкае будаўніцтва . . . . . 30 чал.
2. Калгаснае будаўніцтва. . 15 чал.
3. Санітарнай тэхнікі . . . 15 чал.
Усяго . 60 чал.

Агулам . 200 чал.

Заўвага: Наступныя прыёмы вызначаны ў сьнежні і сакавіку і аб іх будзе абвешчана асобна.

У лік студэнтаў інстытуту прымаюцца асобы, не маладзей поўных 17 год на 1-га жніўня 1930 году.

Асобы, якія жывуць на непрацоўныя даходы або пазбаўленыя выбарчых праў і іх утрыманцы ў інстытут ня прымаюцца.

Жадаючыя паступіць у інстытут падаюць аб гэтым заяву з абавязковым паказаньнем факультэту і спэцыяльнасьці, на якіх яны хочуць вучыцца.

Да заявы прыкладаюцца наступныя дакуманты:
а) дакумант аб узросьце (мэтрыка),
б) дакумант аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын),
в) дакумант аб адукацыі,
г) дзьве фатаграфічныя карткі,
д) медычнае пасьведчаньне аб стане здароўя паступаючага,
е) дакумант аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў пасьля рэвалюцыі,
ж) даведка, засьведчаная нізавой савецкай арганізацыяй аб тым, што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых праў,
з) для сялян—акладны ліст, або засьведчаная копія з яго, па сельскагаспадарчым падатку на 1929-30 г., а для саматужнікаў—адпаведны дакумант аб падатку на 1929-30 г.
і) анкета, засьведчаная прафэсыянальнымі і савецкімі арганізацыямі, прычым адказнасьць (згодна Крымінальнага Кодэксу) за няправільнасьць вестак нясуць асобы, даўшыя весткі і засьведчаўшыя анкету.

УВАГА: 1. Ніякія копіі дакумантаў ня прымаюцца (за выключэньнем дакумантаў аб адносінах да вайсковай службы).

УВАГА 2. Да заявы неабходна прыклясьці паштовыя маркі на 20 кап. для адказу не падавальніку.

Прыём заяў адбываецца з 1-га ліпеня па 20 ліпеня. Ніякія заявы пасьля гэтага тэрміну ня прымаюцца.

Прыймовыя іспыты будуць адбывацца з 1-га па 10-га жніўня. Залічэньне ў студэнты будзе адбывацца да 20 жніўня. Рэзультаты прыёму будуць абвешчаны да 1 верасьня.

Ад прыймовых іспытаў вызваляюцца: усе скончыўшыя рабфакі, курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ і ВНТУ, прафшколы і фабзавучы на базе 7-годкі, тэхнікумы, 9-годку, агульнаадукацыйныя 2-гадовыя курсы на базе 7-годкі а таксама і вытрымаўшыя прыймовыя іспыты пры паступленьні ў ВНУ ў 1928-29 і 1929-30 годзе. Гэтыя асобы падлягаюць выключна клясаваму адбору.

УВАГА I. Усе іншыя асобы (скончыўшыя школы для дарослых павышанага тыпу, агульнаадукацыйныя курсы і прафшколы не на базе 7-годкі, або 7-гадовую працоўную школу, а таксама і ня маючыя зусім спэцыяльнае асьветы павінны трымаць экзамэн у аб'ёме курсу рабфаку.

УВАГА II. Скончыўшыя прафшколы і фабзавуч на базе 7-годкі і тэхнікумы, павінны прадставіць даведку аб сваім вытворчым стажы.

УВАГА III. Курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ і ВНТУ вызваляюць ад экзамэнаў пры паступленьні, калі пасьведчаньні, выданыя аб пасьпяховым скончэньні курсаў падпісаны органам Наркамасьветы.

УВАГА IV. Вызваленьня ад прыймовых іспытаў не павінны прыяжджаць да атрыманьня пісьмовага паведамленьня аб сваім залічэньні.

Агульны справачнік з паказаньнем дакладных правілаў прыёму, праграм, формы анкет і г. д. ёсьць у продажы ў магазынах Белдзяржвыдавецтва.

Пры інстытуце арганізавана справочнае бюро для дачы розных справак па пытаньнях прыёму. Справкі выдаюцца кожны дзень з 3-х да 5 гадзін дня.

Пачатак заняткаў на хэміка-тэхнічным факультэце — 1 верасьня, а на іншых—1 кастрычніка.

Беларускі Палітэхнічны Інстытут.

Нарада камуністых--газэтных работнікаў

У чацьвер, 26-га чэрвеня, а 9-й гадз. раніцы ў памяшканьні ЦК КП(б)Б (заля пасяджэньняў) адбудзецца нарада камуністых-газэтных работнікаў г. Менску.

Яўка абавязкова.

Культпроп ЦК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

СЁНЬНЯ, 25 ЧЭРВЕНЯ

Пашыранае пасяджэньне Мен. АК МОПР'у

Менскі Акруговы Камітэт МОПР'у

)—(СКЛІКАЕ)—(

пашыранае пасяджэньне прэзыдыуму з удзелам старшынь дзесяці вясковых РК МОПР'у

(у памяшканьні Мен. АК МОПР'у, Сав. 87).

ПАРАДАК ДНЯ:
1) Даклад аб выніках Усесаюзнай арг. нарады МОПР'у дакл.—т. КАЛМЫК.
2) Аб нарадку ўдзелу МОПР'у ў сьвяткаваньні 10-гідзьдзя вызваленьня БССР ад белапалякаў дакл.—тав. ЦУДЗІН.
3) Інфармацыя штаба-кіраўніцтва сэзоньнікамі.
З прычыны важнасьці пытаньняў яўка для ўсіх членаў і канд. АК, гарадзкіх РК МОПР'у, а таксама старшынь бюро ячэй—абавязкова.
Запрашаецца жаклтаўскі жаночы актыў.
Пачатак роўна а 7-й гадз.

МЕН. АК МОПР'У.

ВЫШАЎ З ДРУКУ І ПРАДАЕЦЦА ВА ЎСІХ КНІГАРНЯХ БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

Даведнік для асоб, якія паступаюць у навучальныя ўстановы БССР

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР | Гастролі 1-га Маскоўскага пересоўнога тэатру ОПЭРЫ І БАЛЕТУ.
Сёньня, 25 чэрвеня „ФАУСТ“
Білеты ў касе тэатру і раб. касе.
ПАЧАТАК А 9 ГАДЗ. 30 М.
АНОНС! У нядзелю, 29 чэрвеня „РУСАЛКА“ ранішны спэктакль

Кіно „СПАРТАК“.
Ад панядзелка, 23-га чэрвеня
выдатны бытавы фільм
ТРЫПОЛЬСКАЯ ТРАГЭДЫЯ
у 7-мі частках.
УВАГА: Сёньня 4 сэансы.
ПАЧАТАК 1 с.—6 г. 30 м., 2 с.—8 г., 3 с.—9 г. 30 м., 4 с.—11 г.
КАСА—ад 5 гадз. 30 м.

25-га чэрвеня ў 7 г. веч. у садзе „КАМУНАЛЬНІКАЎ“ (Н.-Маскоўская, 18)
склікаецца СХОД ЖЫХАРОЎ ЖАКТ'у № 7 для перавыбару праўленьня ЖАКТ'у.
З прычыны важнасьці пытаньня яўка абавязкова
Праўленьне.

ЗЬБІРАЙЦЕ ЛЕКАВЫЯ ТРАВЫ!
Вучні школ і піянэр-атрады! Арганізуйце брыгады па зборы лекавых траў. Не давайце гінуць у палёх сотням тысяч рублёў!
Збор лекавых траў—
ДОБРЫ ЗАРАБОТАК
для дзяцей беднаты
Белмедгандаль у бягучым годзе, як і ў мінулыя гады, ПРАЗ УСЕ АПТЭКІ ў раёнах і ў гарадох Беларусі купляе высушаныя лекавыя расьліны: валер'яну, белену, талакнянку, бляшку, палын (ліст), ліпавы цьвет, чарніцы, лікарозні (дзеразва), маліну сушаную, ядловец (ягады), спарыньню (чорныя ражкі жыта), дубровку—корань, крапіўны ліст, кару крушыны, кмен, смарчкі, хвайовыя пупышкі, рабіны (ягады), адуванчык (корань), мурашкавыя яйкі, канюшыну чырвоную, церкы корань.
АЧЫШЧАНЫ.
Па ўсіх пытаньнях звяртацца ў бліжэйшую аптэку.
Белмедгандаль, Менск, Плац Волі, 2в.

Кіно-тэатр „Культура“ | З МОГВА МЕРТВЯЦОЎ у 7 частках. Галоўныя ролі выконваюць: Ангельскі генэрал—Д. Гутман, зрадзнік—П. Куцьняцоў, Н. Ятроў, В. Таскін, Е. Чарвякоў. Белы афіцэр—Сямёнаў і інш. Пачатак роўна а 8 гадз. | КАСА ад 6 гадз.
З ПРЫЧЫНЫ ПОСЬПЕХУ 2-гі тыдзень пастаноўкі 2-гі нямецкі фільм „ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК“ Пачатак 1-га сэансу а 7-й гадз. Каса ад 5 г.

Кіно Інтэрнацыянал | ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ МЁРТВАЯ ПЯТЛЯ драма ў 8 частках. У галоўных ролях: Жэні Юго, Вэрнэр КРАУС. Пачатак 1-га с. а 9 г. Каса адкрыта ад 6 г.

Кіно САД (Савецкая, 71) | Мастацкі замежны фільм ЧЫКАГА драма ў 8 ч. У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ: філіс Хэвер і Віктар Варконі. ПАЧАТАК 1-га СЭАНСУ а 7 ГАДЗ. Каса—ад 5 гадз.

Кіно Пралетары | ПРЫГОДЫ АРЫШКІ у 6 частках. Пачатак 1-га сэансу а 2 гадзіне. Каса ад чынена з 12 гадзін.

1-ы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр“

ЛЯЧЭБНІЦА—МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ УЗЕМАДАПАМОГІ
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл. 12
АДКРЫТА ад 9 гадз. рэн. да 9 г. вач.
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
на ўнутраных, хірурґічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурна-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтгэн (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г. 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. вач. штодзённа.
Кансультацыя прафэсароў на ўсіх спэцыяльнасьцях на папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запіс з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дажурныя дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Начное дажурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз. раніцы.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту
Для ўсіх іншых грамадзян за ~~агульна~~-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

У чацьвер 26-га чэрвеня а 7-й гадз. веч. у памяшканьні сталовай (Пралетарская, 11) склікаецца сход жыхароў жакту № 13 для перавыбару праўленьня жакту.
З прычыны важнасьці пытаньня яўка абавязкова.
Праўленьне.

Копыльскі м-савет Менскай акругі склікае на 1 ліпеня гр-на Курыльчыка Сьцяпана Сьцяпановіча па справе скасаваньня шлюбу з гр-кай Курыльчык Алесяю Лявонавай.

50 к. кошт публікацыі аб згубе дакументу

Для здачы АБВЕСТКІ ў газэту „ЗЬВЯЗДА“ звяраецца па тел. 7-81

Мяняю пакой у Бабруйску, у цэнтры гораду на пакой у Менску. Звяртацца: Левінская, 12 кв. 5 а 4 з паловай гадз. дня да 7 гадз. КАГАНУ.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА“ звяраце па тел. 2-49

Менск, Галоўлітбел № 337.

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск.